ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 197 (3305) Пятніца, 30-га жніўня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЕ

У ГАДЗ. НОЧЫ:

БЭРЛІН, 29. У Лаўтэнбургу (цэнтр сялянскага руху ў Шлезвіг Гольдштэйне) адбылася вялікая рабоча-сялянская дэманстрацыя, якая прайшла пад лёзунгам адзінага рэвалюцыйнага фронту рабочых і сялян. У час дэманстрацыі адбылося ўрачыстае братаньне паміж рабочымі і сялянамі

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

КАСЬЦЮКОВІЧЫ, 29. (Ад нашага спэц. кар.) У Вятухноўскім сельсавеце, на тэрыторыі якого на плошчы 1200 гэктараў утварылася камуна імя газ. «Зьвязда» дзень калектывізацыі прайшоў з вялікім уздымам. Беднота і серадняки на заклік партыі адказалі масавым уступленьнем у камуну «Зьвязда».

Агонь па правым апартунізьме ў практычнай рабоце

Тое, што правы, адкрыта апартуністычны, ухіл у партыі зьяўляецца галоўнай небясьпекай у цяперашні пэрыяд нашага будаўніцтва—гэта для пераважнае большасьці членаў партыі зусім ясна і бясспрэчна. Яскравым довадам гэтага зьяўляецца тое аднадушша, з якім уся партыя, уся КП(б)Б ухвапіла пастановы красавіковага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і XVI Усесаюзнай партканфэрэнцыі.

Але зусім бясспрэчна і тое, што далёка НЯ ЎСЕ, якія галасавалі за рэзалюцыю, асуджаючую правых укланістых, робяць у сваёй ПРАКТЫЧНАЙ ПРАЦЫ ЎСЁ ПАТРЭБНАЕ для барацьбы з правым ухілам, для сапраўднага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Учора, у «ЗЬВЯЗЬДЗЕ» мы падалі рад фактаў права-апартуністычнага скажэньня лініі партыі ў практычнай працы.

«Работа» ЛОШНІЦКАГА сельска-гаспадарчага крэдытнага таварыства, якое сыстэматычна забясьпечвала кулацкія элёмэнты вёскі крэдытамі на вялікія сумы, якое адмаўляла ў крэдыце вясковай беднаце.

РОСІЦКАЕ крэдытнае таварыства (Полацкай акругі), ЯКОЕ ВЫКАРЫСТАЛА ФОНД БЕДНАТЫ ДЛЯ КРЭДЫТАВАНЬНЯ ЗАМОЖНЫХ. Аналёгічная «праца» ПЛЕШЧАНІЦКАГА с.-г. таварыства.

Як можна назваць гэтыя факты? На нашай клясавай мове гэта называецца здачай пазыцый кулацтву, гэта ёсьць простае і наглае скажэньне клясавай лініі.

Важна адзначыць тую абставіну, што ўсё гэта праходзіла пад носам партыйнай ячэйкі, пры КІРАЎНІКОХ-КАМУНІСТЫХ.

Камуністыя-кіраўнікі праводзілі яўна правую апартуністычную лінію, ячэйкі-ж да ўсяго гэтага адносіліся прымірэнча, замазвалі факты і гэтым самым, садзейнічалі рабоце нашага клясавага ворага.

КАЛГАСНАЕ будаўніцтва, якое разгортваецца зараз на Беларусі, на якім сканцэнтравана ўвага ўсёй КП(б)Б, у асобных раёнах зрываецца часта з-за невыстарчальнага, слабага адпору кулаку, а часамі з-за простага падтрыманьня яго з боку паасобных камуністых.

У ПААСОБНЫХ СУДОВЫХ органах Беларусі ня ўсё добра ў сэнсе выканаўня генэральнай лініі партыі. Мы даўно пра гэта сыгналізавалі. Але факты, якія мы ўчора падавалі ў «Зьвязьдзе», прымушаюць нас яшчэ раз напамянуць аб правых справах у судзе, аб прымірэнчай палітыцы асобных яго працаўнікоў.

Як, калі ня прымірэнцтвам, можна назваць паводзіны МАЗЫРСКАЙ пракуратуры, якая палітычнае выступленьне кулацтва, што нападала на калгасы, падпальвала асобныя калгасныя пабудовы, травіла пасевы камунараў, кваліфікуе як звычайнае крымінальнае злачынства, а народны суд у адным з раёнаў Мазырскай акругі справу аб кулакох-падпальшчыках зацягвае на доўгія месяцы. Падобных да вышэйпрыведзеных прыкладаў права-апартуністычных скажэньняў клясавай лініі можна прывесьці яшчэ і яшчэ.

Аб чым гавораць усе гэтыя факты? Яны перш за ўсё гавораць аб тым, што партарганізацыі ня могуць абмяжоўвацца прыняцьцем рэзалюцый.

Кожная арганізацыя павінна на СПРАВЕ разгарнуць шырокую паглыбленую барацьбу супроць правага ўхілу ў ДВУХ НАПРАМКАХ: з аднаго боку супроць апартуністычнай ідэалёгіі і СУПРОЦЬ ПРАВАЙ ЛІНІІ Ў ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ.

Выкрыць толькі ідэалёгію цяпер ужо мала. Гэта зусім ня значыць, што мы хоць на ёту памяншаем ідэалёгічную барацьбу.

Патрэбна жорсткая ШТОДЗЕННАЯ барацьба з правым ухілам НА СПРАВЕ. Патрэбна выкрыцьцё КАНКРЭТНЫХ НАСІЦЕЛЯЎ правага ўхілу і прымірэнцтва ў штодзённай практычнай рабоце.

Трэба моцна ўдарыць па практыках правага ўхілу, якія фактычна вядуць да здачы нашых пазыцый клясаваму ворагу, да зрыву сацыялістычнага наступленьня.

БЯЗЬЛІТАСНА ВЫКРЫВАЮЧЫ ДРОБНА - БУРЖУАЗНУЮ КАПІТУЛЯНЦКУЮ ІДЭАЛЁГІЮ ПРАВЫХ, МЫ ПАВІННЫ, РАЗГОРТВАЮЧЫ ТВОРЧУЮ САМАКРЫТЫКУ МАС (ворагамі якой на справе выступаюць правыя), АРГАНІЗАВАЦЬ ШЫРОКІЯ ПАРТЫЙНЫЯ І БЕСПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ ДЛЯ ТАКОЙ-ЖА РАШУЧАЙ І БЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ ПРАВАГА ЎХІЛУ НА ПРАКТЫЦЫ.

Кітайскія белабандыты праваакююць вайну з СРСР

Абстрэл нашых пагранчасьцей артылерыйскім агнём

АРЫШТЫ І ЗЬДЗЕКІ НАД САВЕЦКІМІ ГРАМАДЗЯНАМІ НЯ СПЫНЯЮЦЦА

БЛАГАВЕШЧАНСК, 28. Кітайцы паранейшаму нападаюць на нашы пагранічныя часьці. 19-га жніўня імі быў адкрыты кулямётны і артылерыйскі агонь па нашых пагранічных заставах у раёне разьезду 86 (15 кілёмэтраў на поўнач ад ст. Манчжурыя), адначасова з гэтым над нашай тэрыторыяй лятаў кітайскі самалёт. 23-га жніўня кітайцы абстралялі кулямётным агнём наш катэр на рацэ Усуры, у раёне Іман. 24 жніўня ў раёне Ігнацьеўкі (20 кіл. на ўсход ад Благавешчанску) быў абстраляны наш параход «Карл Лібкнэхт». Пры гэтым быў паранены капітан параходу і некалькі пасажыраў.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ТАВ. БЛЮХЭРА НА СХОДЗЕ ПРАФАКТЫВУ Ў ХАБАРАЎСКУ

ХАБАРАЎСК, 28. На сходзе прафактыву Хабараўску з дакладам аб Ціхаакіянскай канфэрэнцыі прафсаюзаў выступіў тав. Лазоўскі. На тым-жа сходзе з прывітальным словам выступіў прысутны камандуючы асобай Далёка-Ўсходняй арміяй т. Блюхэр. Зьяўленьне камандуючага на трыбуне было спаткана гучнымі аплёдысмэнтамі. Тав. Блюхэр сказаў, што ідучы на сход, ён не разьлічваў выступаць. Тым ня менш ён ахвотна скарыстае сёньнешні вечар, каб перадаць сваё прывітаньне прадстаўніком хабараўскага пралетарыяту, з якім некалькі год таму назад рука аб руку і нага ў нагу рэвалюцыйная армія пад яго камандваньнем вяла барацьбу за вызваленьне Хабараўска ад інтэрвэнтаў і белагвардзейцаў.

Тав. Блюхэр перадае гарачае прывітаньне працоўным Хабараўску ад асобнай арміі. Спыніўшыся коратка на ацэнцы агульнага палітычнага становішча, адным са зьвеньняў якога зьяўляюцца падзеі на К.-Усх. чыг., тав. Блюхэр заявіў, што асобная Далёка-Ўсходняя армія зьяўляецца верным і надзейным аванпостам Савецкага Саюзу на ўсходняй граніцы.

Сходам аднагалосна ўхвалена рэзалюцыя, у якой прафактыў са здавальненьнем адзначае стойкасьць, дысцыпліну, пільнасьць і вытрыманасьць, з якімі Чырвоная армія выконвае свае задачы па ахове граніц Савецкага Саюзу. Сход шле сваё гарачае прывітаньне Чырвонай арміі і чырвонаму флёту.

ЗВЫШ ДВУХ ТЫДНЯЎ СКРЫВАЛАСЯ САВЕЦКАЯ НОТА АД КІТАЙСКАГА ГРАМАДЗТВА

ШАНХАЙ, 28. Толькі сёньня кітайскія газэты публікуюць паведамленьне, што нанкінскім урадам атрымана праз нямецкае пасольства ў Кітаі заява савецкага ўраду адносна набегаў белагвардзейскіх і кітайскіх атрадаў на савецкую тэрыторыю, зробленую нямецкаму пасольству ў Маскве звыш двух тыдняў назад. (ТАСС).

САВЕЦКІЯ ГРАМАДЗЯН СУДЗЯЦЬ ЗА САВЕЦКАЕ ПАДДАНСТВА

ТОКІЁ, 28. З Харбіна паведамляюць: «Арышты савецкіх грамадзян на станцыях К.-Усх. Ч. яшчэ працягваюцца. Учора ў Харбін прывезена 60 арыштаваных, якія адпраўлены ў Сунвэйскі канцлягер. Для характарыстыкі абстаноўкі важна сказаць, што абвінаваўчы акт па справе савецкага грамадзяніна Паніна пачынаецца так:

«Падсудны зьяўляецца савецкім падданым, а таму ён зьяўляецца адным з камуністых названае дзяржавы». (ТАСС).

ФІНАНСАВЫЯ ЗАТРУДНЕНЬНІ МУКДЭНУ

ТОКІЁ, 28. Мукдэнская ўлада пастанавіла вынізіць пэнсію служачых у дзяржаўных установах Манчжурыі на 20 проц., нібы з мэтай адлічэньняў у фонд ваенных патрэб, на самай-жа справе, у выніку фінансавых затрудненьняў мукдэнскіх улад. Гэта пастанова выклікае нездавальненьне сярод служачых. Спачатку канфлікту хлеб у Харбіне падражаў у два разы. (ТАСС).

НАГЛАЯ ХЛУСЬНЯ КІТАЙСКІХ БЕЛАБАНДЫТАЎ

ТОКІЁ, 27. Паводзе вестак, атрыманых з Харбіна, на станцыі Манчжурыя засталося ўсяго 7 сем'яў, якія падлягаюць высылцы і чакаюць легальнага праезду. Рэшта пасаджаны ў канцэнтрацыйныя лягеры. Гэтых чакае той-жа лёс. Кітайская ўлады пашыраюць весткі, што савецкая ўлада адмаўляе ў падачы ваганаў пры прыёме тых, што высылаюцца, і што з прычыны гэтага высылка савецкіх грамадзян спынена.

УВАГА ТАСС: Паводзе вестак, атрыманых ТАСС з аўтарытэтных крыніц, **вестні, што пашыраюцца кітайскаю ўладаю аб тым, нібы савецкія ўлады адмовіліся прадастаўляць вагоны для прыёму савецкіх грамадзян, якія высылаюцца з Манчжурыі, іржывыя ад пачатку да канца.** Нямецкаму пасольству ў Маскве заяўлена, што ўсе меры сваячасова ўжыты. Кітайская ўлада з кожным днём узмацняе рэпрэсіі над савецкімі грамадзянамі і прабуе пры дапамозе падобных іржывых вестак апраўдаць спыненьне адпраўкі савецкіх грамадзян на бацькаўшчыну і вымяшчэньнем іх у канцэнтрацыйным лягеры

АРЫШТАВАНЬНЯ САВЕЦКІЯ ГРАМАДЗЯНЕ ЎТРЫМЛІВАЮЦЦА Ў НАДЗВЫЧАЙНА АНТЫСАНІТАРНЫХ УМОВАХ І ХВАРЭЮЦЬ

ТОКІЁ, 28. Як паведамляе агенцтва «Дэмпа Цусін» з Харбіну, харбінскія чужаземныя колы абураны абыходжаньнем кітайскіх улад з арыштаванымі савецкімі грамадзянамі, лік якіх даходзіць да тысячы (у тым ліку жанчыны і дзеці). Арыштаваныя ўтрымліваюцца ў надавычайна анты-санітарных умовах і хварэюць. Чужаземцы заяўляюць, што адмаўленьне ад экстэрытарыяльных праў у Кітаі зьяўляецца немагчымым, бо Кітай яшчэ не зьяўляецца закончанай дзяржавай.

ПАКАРАНЬНЕ СЬМЕРЦЮ 4-х САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН

ТОКІЁ, 28. Як паведамляе агенцтва «Дэмпа Цусін» са стан. Манчжурыі, у Джаланоры пакараны сьмерцю 4 савецкіх грамадзяне за тое, што яны выпадкова даткнуліся да ваенных дротавых загародак.

АРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІХ АТРАДАЎ У ПАЛАСЕ К.-УСХ. ЧЫГ.

ЧЫТА, 27. Арганізацыя белагвардзейскіх атрадаў у паласе К.-Усх. Ч. вядзецца ўсё больш адкрыта. Газэты стракацяць прозьвішчамі ўсё новых правадыроў—Качакуніна, Варокава, Лысенка і інш. Кітайцы пацьвярджаюць, што апошнім аказваецца дапамога з боку адной зацікаўленай дзяржавы, падразумяваецца Японія.

Прыбўшыя з Харбіна паведамляюць, што работа мэханічных майстэрань амаль спынена. Большасьць машын паламана нявопытнымі кітайцамі, якімі замянілі савецкіх работнікаў. Паламаны самы магутны паравы молат.

ЗЬДЗЕКІ КІТАЙСКАЙ УЛАДЫ НАД САВЕЦКІМІ ГРАМАДЗЯНАМІ

ТОКІЁ, 23. Як паведамляюць з Харбіна кіраўнік К.-Усх. Ч. выдаў загад аб ачышчэньні ў 7-мі дзенны тэрмін кватэр, якія займаюцца савецкімі служачымі, што самі звальняюцца, незалежна ад таго, ці атрымалі яны пэнсію, ці не. Гэты загад зьяўляецца яўным парушэньнем палажэньня аб служачых. **Фактычна выкідваецца на вуліцу некалькі тысяч сем'яў, якія пазбаўлены, нават, права атрымаць уласныя ўзносы з пэнсіённай касы.** (ТАСС).

ФІНАНСАВЫ КРЫЗІС У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ПЭЙПІН, 29. Як падае агенцтва «Азіяцік», моцны фінансавы крызіс у Паўночным Кітаі працягваецца. 7 буйных кітайскіх банкаў у Пэйпіне і Цзян-Цзіне спынілі плацяжы. Справы многіх кітайскіх фірм знаходзяцца ў крытычным становішчы. (ТАСС).

АМЭРЫКА НЕ ЗАДАВОЛЕНА ПАЛІТЫКАЮ НАНКІНА

ВАШЫНГТОН, 27. Дзяржаўны дэпартамэнт, не даючы ніякіх падрабязнасцяй, заяўляе, што становішча Манчжурыі прадстаўляецца яму сур'ёзным. Дзяржаўны дэпартамант абвясьціў, што місія Амэрыкі застаецца ў Пэйпіне, бо пабудова дому пасольства ў Нанкіне будзе каштаваць дорага і акрамя таго, няма ўпэўненасьці ў тым, што Нанкін застанецца сталіцаю, хаця і ходзяць чуткі, нібы прадстаўнік ПАЗШ у Кітаі будзе пераіменаваны ў пасла, хаця дзяржаўны дэпартамант да гэтага часу не папрасіў у кангрэса дадатковага асыгнаваньня на адпаведнае павялічэньне акладу пэнсіі Мак Мэрэю. Відаць, дзяржаўны дэпартамант хоча даць вразумець Нанкіну, што ён не задаволены яго палітыкай.

РАЗГАЛОСЬСІ Ў ЛЯГЭРЫ МУКДЭНЦАЎ

ТОКІЁ, 28. 27-га жніўня Чжу Шао-ян выехаў праз Пэйпін у Нанкін. У гутарцы з супрацоўнікам «Токіё-Асахі» Чжу Шао-ян заявіў: «Савецка-кітайскія перагаворы ўскладняюцца тым, што ў Чжан Сюэ-ляна існуюць разгалосьсі з генэраламі Цян Цзо-цянам. Першы дамагаецца таго, каб канфлікт быў вырашаны пры ўдзеле Нанкінскага ўраду, другі—вырашэньня цытаньня мясцовымі сродкамі, незалежна ад нанкінскага ўраду».

Памяці таварыша Я. Ф. Фабрыцыуса

Узмацненьне баявой падрыхтоўкі чырвоных палкоў—будзе найлепшым довадам нашае пашаны памяці загінуўшага гэроя Чырвонай арміі

Тыфліс, Рэвваенсавет Каўкаскай Чырвонаштандартнай арміі

Трагічная пагібель памочніка камандуючага войскам РСЧА Яна Фрыцавіча Фабрыцыуса зьдзівіла ўсіх, хто яго ведаў, і хто з ім працаваў разам.

Выключная энэргія, рэвалюцыйная загартаванасьць і бальшавіцка-ленінская вытрыманасьць яскрава і арганічна злучыліся з жалезнай стойкасьцю байца Чырвонае арміі. Шчырая адданасьць справе пралетарскае рэвалюцыі высунула яго ў першыя рады байцоў Чырвонае арміі. Яго баявая работа на франтох грамадзянскае вайны адзначана нашай партыяй і савецкай уладай.

Ян Фрыцавіч Фабрыцыус зьяўляўся адным з тых нямногіх гэрояў, якія за свае баявыя ўчынкі ўзнагароджаны чатырма ордэнамі чырвонага сьцягу.

Байцы, камандзіры і палітпрацаўнікі войск Беларускай ваеннай акругі, засмучаныя катастрофаю, схіляюць свае галавы перад сьвежай магілай дарагога і любімага ўсімі Яна Фрыцавіча. Згуртуем шчыльней нашы рады.

Узмацненьне баявой падрыхтоўкі і палітычнага выхаваньня чырвоных палкоў будзе лепшым довадам нашае пашаны памяці загінуўшага бальшавіка і гэроя камандзіра Чырвонае арміі.

Рэвваенсавет БВА: ЯГОРАЎ, КАЖЭЎНІКАЎ, ГАМАРНІК.

НА ГААГСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

Па фінансавых пытаньнях дасягнута прынцыповая згода ЗА КОШТ НЯМЕЧЧЫНЫ

БЭРЛІН, 27. Прэса з няўтоеным пэсымізмам канстатуе той факт, што Гаагскае паразуменьне дасягнута за кошт Нямеччыны. Друк аднадумна падкрэсьлівае, што Нямеччына можа прыняць гэтае паразуменьне толькі пры ўмове, што ёй будзе дана згода на задавальненьне яе палітычных патрабаваньняў па пытаньні аб эвакуацыі Рэйнскай вобласьці, аб кантролі, рэжыме ў Саарскай вобласьці і аб ліквідацыі канфіскаванае нямецкае маемасьці ў Англіі (ТАСС).

ГААГА, 28. З апублікаванага англійскай дэлегацыяй прынцыповага паразуменьня відаць, што яно павышае англійскую часьць на 40 млн. марак замест 48 млн., якія патрабавала ангельская дэлегацыя, і складае агульную суму ангельскай часьці разам з бязумоўнай часткай нямецкіх плацяжоў у 96 млн. марак, замест 120, на якія прэтэндаваў Сноўдэн.

Паводле верагодных вестках павышэньне ангельскай часткі зроблена за кошт Нямеччыны. Што датычыць паставак натурай, дык італьянская дэлегацыя згадзілася гарантаваць Англіі на бліжэйшыя тры гады дадатковую закупку ангельскага вугалю па нізкіх цэнах ангельскага экспартнага рынку ў разьмеры мільёну тон на год. (ТАСС).

БЭРЛІН, 28. Газэта «Дэйтчэ Дыплёматыш Палітышэ Карэспандэнтс» піша: «Пасьля таго, як адбылася згода паміж дзяржавамі—крэдытарамі, мы падыходзім да асноўнага пытаньня, што стаіць перад канфэрэнцыяй. Сусьветную грамадзкую думку старацца пераканаць быццам Нямеччыне застаецца толькі сказаць «амін», пацьвярджаючы згоду.

Такі пункт погляду ўжо рашуча адхіліла нямецкая дэлегацыя ў Гаазе. Мы не хацелі распальваць ту барацьбу, што цягнулася некалькі тыдняў, якая рабіла цяжкае ўражаньне як на нас, так і на ўвесь сьвет.

Але мы таксама ня можам згадзіцца на такі канец канфэрэнцыі, які ня дасьць нямецкаму народу задаваленьня па асноўных пунктах пытаньня—аб вызваленьні нямецкай тэрыторыі з-пад акупацыі і аб поўным аднаўленьні нямецкага сувэрэнітэту». (ТАСС).

Курс акцый на біржы падняўся

БЭРЛІН, 28. Біржа адказала на паведамленьні аб гаагскай згодзе шпаркім павышэньнем курсу ўсіх акцый. Курс многіх акцый павысіўся на 15-17 фунтаў. (ТАСС).

Ружовая заява Брыяна Штрэзэману адносна Рэйнскай вобласьці

ПАРЫЖ, 28. Агенцтва Гавас паведамляе з Гаагі:

«Брыян заявіў Штрэзэману, што пытаньне аб Рэйнскай вобласьці не выклікае больш сур'ёзных затрудненьняў. Паводле вестак Брыян даў Штрэзэману патрэбныя запэўніваньні і згадзіўся на тое, каб палітычная камісія (што абгаворвае пытаньне аб Рэйнскай вобласьці) была склікана ў сераду, бо дасягнутая па фінансавых пытаньнях прынцыповая згода зьяўляецца фактам, які здарыўся». (ТАСС).

Не аслабляйце ўвагі да чысткі партыі

Некаторыя даныя даваляюць ужо і цяпер сказаць, што далёка ня ўсюды вахоўваецца зусім правільны падыход да праверкі розных катэгорый партыйных арганізацый. Так, паводле даных, процант выключаных па вытворчых ячэйках пакуль што вышэй процанту выключаных у савецкіх ячэйках устаноў. У вытворчых ячэйках, праверваных па 32 акругах, процант выключаных—10,6, вышэйшых мэханічна і добраахвотна ў часе праверкі—1,2. А ў ячэйках устаноў процант выключаных—9,2 пры міжзярным процанце (0,38) вышэйшых добраахвотна і мэханічна. Мы лічым патрэбным паказаць на гэтыя суадносіны ў самым пачатку праверкі вытворчых ячэек дзеля таго, каб лінія была выпрастана там, дзе, бязумоўна, некаторыя недахваты, якія здараюцца галоўным чынам з-за ня досыць уважлівага індывідуальнага падыходу да таварышоў, што правяраюцца, і няўважлівага вынучэньня ўмоў жыцьця рабочае клясы, якія не заўсёды даюць магчымасьць рабочаму члену партыі падняць у належнай ступені сваю палітычную пісьменнасьць, правяць сваю актыўнасьць на грамадзка-партыйнай рабоце.

Трэба адзначыць, што ва многіх арганізацыях пры праверцы зусім правільна завострана ўвага на правядзенні клясавай лініі партыі. Чыстка партыі дапамагае паставіць пытаньне аб барацьбе з правым ухілам на вялікую прынцыповую вышыню, выхоўваць на гэтай барацьбе усіх членаў партыі, выпраўляць у гэтых адносінах лінію ўсіх партыйных ячэек, усіх партыйных арганізацый. Усякая спроба адкрыта абараняць правыя погляды сустракае і павінна сустрэць самы рашучы адпор з боку ўсёй партыйнай арганізацыі. Само сабою зразумела, што было-б няправільна ня бачыць, што ў нашых радох застаюцца людзі з рэшткамі трацкісцкай ідэалёгіі, з «левымі заскокамі», супроць якіх партыя павінна рашуча змагацца.

Партыя з самага пачатку дала зусім правільную ўстаноўку чысткі сваіх радоў. Чыстка павінна праходзіць зусім не ў капаньні ў дробязях асабістага жыцьця, чыстка павінна выкрыць партыйны твар кожнага члена партыі, клясавы яго твар, яна павінна выкрыць у асобе ячэйкі і яе кіраўніцтва. Але гэта не азначае, што мы павінны пакінуць у баку факты бытавога разлажэньня, бытавога загніваньня. І ў гэтых адносінах чыстка вельмі навучальная. Яна дае нам магчымасьць выкрыць такія факты перад масай, вырваць з нашых радоў насіцеляў бытавога разлажэньня і загніваньня, аздаравіць нашы рады.

Мы адзначалі ўжо ў «Правде» адзін з недахопаў праверкі. Ня гледзячы на тое, што пастанова партыі аб праверцы і чысткі самым цесным чынам зьвязвае гэтую праверку з вярбоўкай новых членаў партыі з асяродзішча вытворчых рабочых і асабліва рабочых буйных прадпрыемстваў і жаночага пралетарыяту і з асяродзішча батрацка-бядняцкіх сялянскіх мас, мы не разгарнулі да гэтага часу гэты бок нашай работы, як трэба.

Зразумела, у выніку чысткі нам прыдзецца правесьці значнае перабудаваньне сваіх радоў. Праверка павінна дапамагчы нам аздаровіць і кіруючыя кадры. Праверка актывізуе масы, яна не дапускае існаваньня балота. Чыстка ня толькі лепшы сродак узварушыць абыватальшчыну, але і вытрасьці гэтую абыватальшчыну з радоў партыі. Зразумела, гэта вытрахваньне абыватальшчыны з партыі нічога агульнага ня можа мець з устаноўкай, данай, напрыклад, у артыкулах Шацкіна і іншых, у якіх пад паняцьце абываталя падводзяцца адданыя партыі таварышы, уся віна якіх заключаецца ў тым, што яны ніколі ня хісталіся ў падтрыманьні партыйнай лініі.

Кантрольныя камісіі і партыйныя камітэты і беспартыйныя масы павінны непаслабна сачыць за ходам праверкі, на ходу чысткі выпраўляючы памылкі і недахваты; скарыстаць чыстку, як адзін з моцных сродкаў падняць на вышэйшую ступень прынцыповае загартаваньне, дысцыпліну, згуртаванасьць партыйных арганізацый, усьведамленьне задач, што стаяць перад партыяй, высуне новых людзей з выхаваных партыяй пралетарскіх кадраў. Вылучэньне гэтых кадраў зьяўляецца аднэй з задач чысткі.

(«ПРАВДА»).

УСЕ СІЛЫ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

на пасьпяховае правядзеньне хлебазагатоўчай кампаніі

МАСКВА, 29. УсеЦСПС запрапанаваў прафарганізацыям аказаць шырокую дапамогу пасьпяховаму правядзеньню хлебазагатоўчай кампаніі. Для гэтай мэты трэба, з аднаго боку, непасрэдна ўдзельнічаць у хлебазагатоўках (пасылкай работнікаў на месцы, арганізацыяй рабочых брыгад і г. д.), а з другога — весьці растлумачальную работу ў вёсцы сярод членаў прафсаюзаў і праз іх сярод сялянства. УсеЦСПС прапануе разгарнуць повыя выезды рабочых брыгад для ўдзелу ў хлебазагатоўках і падрыхтоўчай рабоце да асеньняй пасеўнай кампаніі. Паміж брыгадамі і сёламі рэкамэндуецца абвясьціць сацыялістычнае спаборніцтва. (ТАСС).

МАСКВА. Прэзыдыум ЦК саюзу с.-г. рабочых запрапанаваў усім сваім арганізацыям безадкладна разгарнуць сярод батрацтва шырокую растлумачальную работу аб значэньні хлебазагатовак. Трэба дабіцца таго, каб кожны батрак, рабочы саўгасу і лесаруб зразумелі патрэбнасьць поўнай і хутчэйшай здачы хлеба дзяржаве і каб ніводзін пуд яго не папаў да прыватнікаў, якія разам з кулакамі стараюцца сарваць дзяржаўныя хлебазагатоўкі. Пытаньне аб хлебазагатоўках трэба прапрацаваць на шырокіх батрацкіх сходах. Трэба арганізаваць спэцыяльныя брыгады з рабочых саўгасаў для дапамогі правядзеньню хлебазагатовак у вёсцы. (ТАСС).

МАСКВА. **Прэзыдыум ЦК саюзу саўгандальслужачых** лічыць асноўнай задачай саюзу ў сучасны момант — уцягненьне ўсіх служачых, што працуюць на сяле, у кампанію хлебазагатовак. Прэзыдыум ЦК саюзу запрапанаваў усім сваім арганізацыям рашуча змагацца са скажэньнем клясавай лініі на сяле, паслабленьнямі кулацтву і г. д. Усе чужыя элемэнты павінны быць выдалены з хлебазагатоўчага апарату. (ТАСС).

Дэлегацыя чырвоных франтавікоў у Менску

Учора, а 10 гадз. 30 мін. увечары ў Менск прыехала з Лейпцыгу дэлегацыя саюзу чырвоных франтавікоў. Дэлегацыю сустракалі менскія камсамольцы і курсанты АБВШ, якія гучным «ура» і сьпевам «Інтэрнацыяналу» спаткалі прыехаўшых чырвоных франтавікоў.

Тут-жа на пэроне адбыўся мітынг, на якім прыбыўшых гасьцей віталі: ад ЦК і МК ЛКСМ—т. Нільсон, ад ЦК ЛКСМБ —тав. Галавач, а таксама дэлегаты ад заводу «Энэргія» і курсантаў АБВШ.

На прывітаньні адказвалі дэлегаты саюзу чырвоных франтавікоў тав. Грынвальд (тэхнічны кіраўнік забароненага Юнгфронту) і старшыня дэлегацыі Вайтэр Рэлянэр (палітычны кіраўнік забароненага Юнгфронту і карэспандэнт газ. «Чырвоная Зьмена»), якія перадалі шчырае прывітаньне ад нямецкіх пралетараў.

Ганароваму чырвонаармейцу № палка СТАРШЫНІ СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДУ

У дзень 11-гадовага юбілею Н-га стр. палка, мы, байцы і камандны склад, пасылаем шчырае прывітаньне ганароваму чырвонаармейцу нашага палка—старшыні Савету Народных Камісараў БССР т. Галадзеду і побач з гэтым адначасова запэўняем, што кожную хвіліну гатовы па закліку ЎсеКП(б) і савецкае ўлады выступіць на абарону СССР. Таксама даем абяцаньне, што існуючыя недахопы ў баявой падрыхтоўцы мы зжывем у самы кароткі тэрмін, тым самым узмацнім абароназдольнасьць граніц БССР і ўсяго СССР.

ПРЭЗЫДЫУМ УРАЧЫСТАГА СХОДУ.

У СССР ЕДЗЕ СКАНДЫНАЎСКАЯ РАБОЧАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ

СТАКГОЛЬМ, 28. У сераду выехала ў СССР скандынаўская рабочая дэлегацыя, у склад якой уваходзяць 22 дэлегаты ад шведзкіх, 29—ад нарвэскіх і 11—ад дацкіх рабочых. Выбары прайшлі ня гледзячы на жорсткія перашкоды з боку рэфармістых. Перад ад'ездам усёй дэлегацыі адбыўся масавы мітынг у Стакгольме.

Рабоча-сялянскі банк аднавіў свае апэрацыі

ПАРЫЖ, 28. У першы дзень аднаўленьня апэрацый рабоча-сялянскага банку, новыя ўклады перавысілі патрабаваньні на 50.000 франкаў, пры чым адкрыта 47 новых бягучых рахункаў. Апублікаванае ў некаторых газэтах афіцыёзнае паведамленьне прымушана прызнаць, што балк аднавіў свае апэрацыі ў нармальных абставінах. Збор на карысьць «Юманітэ» даў 140.000 франкаў.

Крывавыя падзеі ў Палестыне

БРАНЯВІКІ, САМАЛЁТЫ, БОМБЫ і ПАЛІЦЫЯ--СРОДКІ „МІРНАЙ" ПАЛІТЫКІ МАКДАНАЛЬДА

Арабскія атрады абстрэльваюцца з самалётаў

ЛЁНДАН, 28. Становішча ў Палестыне мала зьмянілася. У Ерусаліме, Яфе і Хайфе спакойна. Хваляваньні ў раёнах Хайфы прыдушаны дэсантам. Арабскія атрады ў раёнах Хайфы і па ўзгорках наўкола Ерусаліма абстраляны з самалётаў. Тэлефонныя лініі, што вядуць з Ерусаліма ў Хайфу і Іэрэрыю, перарэзаны (ТАСС).

* * *

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 28. Як падае турэцкі друк з Ерусаліма, хваляваньні апошніх дзён лічаць пачаткам шырокай кампаніі арабаў супроць брытанскага мандату на Палестыну. Далей друк падае, што напады арабаў на Тэль-Авів і яўрэйскія с.-г. калёніі былі разьбіты яўрэйскімі добраахвотнікамі. Хваляваньні ў прыгарадах Ерусаліма спыняюцца. (ТАСС).

Арабы супроць ангельскай апекі над Палестынай

БЭРЛІН, 28. Сірыйска-палестынская дэлегацыя ў Жэнэве перадала сакратарыяту Лігі Нацый заяву арабскага кангрэсу ў Палестыне, які ўскладае адказнасьць за падзеі ў Палестыне на сіяністых, Англію і Лігу Нацый. Кангрэс заклікае раду Лігі Нацый ануляваць ангельскі мандат на Палестыну. Далей арабы пратэстуюць супроць паводзін ангельскіх войск у часе хваляваньняў у Ерусаліме (ангельскія войскі кідалі ў арабаў бомбамі) і патрабуюць безадкладнага назначэньня расьсьледваньня апошніх падзей. (ТАСС).

* * *

Наўмыснае распальваньне нацыянальнай варожасьці—звычайны спосаб, з дапамогай якога ангельскі імпэрыялізм умацоўвае сваё панаваньне ў калёніяльных краінах. У Індыі ангельскія агенты арганізуюць крывавыя сутычкі паміж індусамі-мусульманамі і індусамі-будыстымі. У Палестыне—сутычкі паміж яўрэямі і арабамі.

Увесь парадак ангельскага кіраўніцтва Палестынай знарок пабудаваны такім чынам, каб абвостраная нацыянальная варожасьць стала няўхільнасьцю. Мала таго, у паасобных выпадках сутычкі выклікаюцца для ажыцьцяўленьня вызначаных мэт **бягучай палітыкі ангельскай улады.** Як відаць, і ў даным выпадку мы маем справу з сутычкамі, якія, прынамсі часткай, знарок выкліканы з зусім пэўнай мэтай.

Ня так даўно мы зьмянчалі паведамленьні аб бурных першажнівеньскіх забастоўках і дэманстрацыях як арабскіх, так і яўрэйскіх рабочых у Палестыне. Гэтыя яўныя адзнакі зараджэньня рэвалюцыйнага рабочага руху, натуральна, сур'ёзна занепакоілі ангельскую ўладу, і яны пасьпешна пусьцілі ў ход паліцэйскае падбухторваньне, каб зьбіць малады рэвалюцыйны рух з правільнага шляху **і накіраваць клясавае абурэньне супроць ангельскага імпэрыялізму па лініі нацыянальнай варожасьці.**

Акрамя таго, крывавыя сутычкі, што ахапілі ўсю краіну, зьяўляюцца, зразумела, надавычай выгаднай прычынай для абвяшчэньня ваеннага становішча, для пасылкі ў Палестыну дадатковых атрадаў войск і для таго, каб пад шумок арабіць крывавую расправу над рэвалюцыйнымі выступленьнямі пралетарыяту. Недарма ў тэлеграме гаворыцца аб выпадках, калі паліцыя страляла ў натоўп, а салдаты кідалі бомбы.

Замежны гандаль Польшчы

ВАРШАВА, 19. Ліпень месяц бягучага году прынёс нечаканы падарунак польскаму замежнаму гандлю, які ў працягу двух год хранічна меў дэфіцытны гандлёвы балянс. Вось, дэфіцыт гэты ў маі мінулага году складаў 163 млн. злотых. Упяршыню за 28 месяцаў экспар

Як імпэрыялістыя рыхтуюцца да вайны

З БРАШУРЫ ФРАНЦУСКАЙ КАМПАРТЫІ

Цэнтральны орган французкай кампартыі «Юманітэ» выпусціў бясплатным дадаткам брашуру «Як яны рыхтуюцца да вайны». Гэта брашура нагадвае сабою збор дакладных даных (на падставе афіцыйных паведамленняў) і фактаў, якія даюць яскравы малюнак таго, як ліхаманкава рыхтуюцца міжнародныя імпэрыялістыя да новай бойні паміж сабою і да паходу супроць СССР.

70 МІЛЬЯРДАЎ НА ВАЙНУ

Францыя, Амэрыка, Англія, Японія і Італія трымаюць зараз стала ўзброенымі каля 3 мільёнаў чалавек. Суседзі СССР—Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Польшча і Румынія, якія адыгрываюць ролю паслухмянае зброі ў руках буйных капіталістычных дзяржаў, мелі ў 1928 г. 600.000 чалавек узброеных (цыфра гэта лічба павялічылася).

У 1913 годзе лік вайскова-абвучаных у пяці названых буйных імпэрыялістычных дзяржавах складаў прыблізна 7-8 мільёнаў чалавек, цыфра гэта колькасьць складае вялізную лічбу ў 20 мільёнаў чал.

Навошта, запытаньне, трымаліся-б такія вялізныя арміі, калі-б не стаяла ў парадку дня вайна?

Затраты на ўзбраеньне растуць разам з балбатнёю аб разбраеньні. Замест 26 з лішнім мільярдаў франкаў, якія былі затрачаны на ваенныя патрэбы ў 1913 годзе, зараз тымі-ж 5 імпэрыялістычныя дзяржавамі асыгнавана 70 мільярдаў. Толькі за тры апошнія гады ваенныя асыгнаваньні гэтых дзяржаў павялічыліся на 36 мільярдаў.

Амэрыка выдаткавала ў 1928-29 годзе каля 10 мільярдаў на флёт. Англія ў тым-жа 1928-29 г. выдаткавала на флёт больш 8 мільярдаў, што ў параўнаньні з мінулым годам дае павялічэньне на 12 проц. А Францыя за гэты-ж час павялічыла выдаткі на 40 проц.

Выдаткі на паветраны флёт павялічыліся ў сярэдзім для тых-жа пяці дзяржаў амаль у тры разы, пачынаючы з 1923 году і дасягнуўшы ў 8 мільярдаў франкаў.

Усё гэта, папамінаем, паводле афіцыйных даных, вельмі зьменшаных даных. Гэты бязупынны рост выдаткаў на зброю ідзе ня толькі за кошт колькасьці ўзброеньняў, але і якасьці. Імпэрыялістыя маюць цяпер такія страшэнныя сродкі зьнішчэньня, аб якіх і паміну ня было ў мінулую імпэрыялістычную вайну.

Верныя слугі імпэрыялістых, якія акружаюць СССР, старанна ідуць па прыкладу сваіх гаспадароў. Асабліва адзначаецца Польшча. Яна ўзбройваецца з такою шпаркасьцю, **што ўжо нагадвае сабою больш узброены лягер, чым мірную краіну. Ліхаманкавае ўзбраеньне Польшчы, якое магчыма толькі дзякуючы дапамозе імпэрыялістычных дзяржаў, і ў першую чаргу Францыі, гаворыць аб тым, што пагроза вайны больш за ўсё накіравана супроць СССР.**

Ваенныя выдаткі Польшчы на 1929-30 год павялічаны больш чым на 55 мільёнаў злотых у параўнаньні з 1928-29 г. Лік рабочых на ваеннай прамысловасьці дасяг у 1928 годзе 65.000 замест 21.000 у 1926 годзе.

У АДНЫМ ГОРАДЗЕ—СТО ФАБРЫК ВАЙСКОВАЕ АМУНІЦЫІ

Францускія рабочыя і сяляне плацяць ў гэтым годзе 70 мільёнаў франкаў падатку. З кожнай сотні франкаў падатку, што плаціцца працоўнымі, 60 франкаў ідзе на аплаты ваенных даўгоў іншым дзяржавам, 20 франкаў—на падрыхтаваньні для будучай вайны. 14 мільярдаў франкаў траціць Францыя ў гэтым годзе на падрыхтоўку да новай вайны. **Калі-б такія грошы асыгнаваць на павялічэньне зарплаты рабочым, то кожны рабочы мог-бы кожны дзень атрымаць дадатковa па 5 франкаў.**

Гэтыя гіганцкія выдаткі выклікаюцца і надзвычайна вялікім барышом прадпрыемцаў ваеннай прамысловасьці. Штогодна прыбыткі гэтых паноў вылічаюцца дзесяткамі і сотнямі мільёнаў франкаў. Так, прыбытак фабрык Лёнскае акругі (Францыя), якія вырабляюць атрутныя газы, дасягнуў у 1928 г. 173 мільёнаў. Каб уявіць колькасьць прадпрыемстваў, якія працуюць выключна на вайну, досыць паказаць, што ў адной толькі акрузе Сэны (Францыя) ёсьць больш ста фабрык ваеннае амуніцыі.

Асаблівая ўвага зьвернута цяпер на выраб атрутных газаў. У брашуры, выданай «Юманітэ», падаецца доўгі сьпіс прадпрыемстваў, якія вырабляюць гэтыя газы.

ПАТАЕМНЫЯ ДАГАВАРЫ І ЯЎНЫЯ ПРАСЬЛЕДАВАНЬНІ

Побач з агульнымі падрыхтаваньнямі да вайны вядуцца падрыхтаваньні да паходу супроць СССР. Згодна пункту 10 сакрэтнага франка-польскага ваеннага дагавору, Францыя абавязуецца арганізаваць вайсковую раду для кіраўніцтва апэрацыямі польскае арміі супроць СССР. Яна абавязуецца таксама напоўніць кадры польскіх афіцэраў французкімі, забясьпечыць польскую армію ваеннымі прыпасамі і блёкаваць пры дапамозе флёту расійскае ўзьбярэжжа.

Францыя запята вырабам ваеннай амуніцыі для Польшчы.

Румынскі буржуазны друк адкрыта гаворыць аб дагаворанасьці паміж Румыніяй і Польшчай па гэтым-жа пытаньні.

На чале польскай, чэхаславацкай, румынскай і югаслаўскай армій стаяць французкія генэралы. Афіцэры французкага ваеннага штабу выкладаюць у вайсковых навучальных установах паказаных краін. У вайсковых выдатках Францыі на 1929 г. прадугледжана 15 мільёнаў франкаў на аплату 93 афіцэраў, якія прыкамандыраваны да Польшчы і іншых краін.

Адначасова з падрыхтоўкай да вайны ўзмацняецца націск на рэвалюцыйныя арганізацыі рабочае клясы. Ліга Нацый абернута ў інструмант, які павінен усыпіць пільнасьць рабочых. Работа гэтай Лігі, прысьвечаная гутаркам аб разбраеньні, займае 14 тысяч старонак паперы. Калі мы да іх дадамо мільёны тон паперы розных часопісяў, якія гавораць аб разбраеньні, дык атрымаем некаторае прадстаўленьне аб тэй апрацоўцы грамадзкае думкі, якая вядзецца капіталістымі пры дапамозе сацыялістых.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Праз паўтара тыдні пачынаецца праверка і чыстка савецкіх ячэек КП(б)Б

Праверка мабілізуе ўвагу савецкіх ячэек на барацьбу з бюракратызмам, з праявамі правага ўхілу, са скажэньнямі клясавае лініі ў практычнай рабоце

ЯЧЭЙКІ ГАНЕБНА СЛАБА ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ЧЫСТКІ

Выкарыстаць тэрмін, які застаўся да чысткі, для ўзмоцненай падрыхтоўкі партыйных і беспартыйных мас.—Забясьпечыць удзел рабочых з прадпрыемстваў у чыстцы савецкіх ячэек

(НА НАРАДЗЕ ПАРТАКТЫВУ г. МЕНСКУ)

Пазаўчора ў клюбе імя Карла Маркса адбылася агульна-гарадзкая нарада партыйнага актыву Менску па пытаньні аб падыходзячай чыстцы савецкіх ячэек КП(б)В. З дакладам выступіў старшыня Менскай АКК КП(б)В тав. **Дамброўскі.**

Праверка і чыстка савецкіх ячэек,—кажа дакладчык,—пачнецца 7-10 верасьня. У першую чаргу будуць праверены гандлёвыя, ваенрэцкайныя і вузавіцкія ячэйкі. Спачатку ў кожным гарадзкім раёне будуць працаваць 3 праверачныя камісіі.

Да чысткі савецкіх ячэек мы падыходзім з багатым вопытам праверкі вайсковых і вясковых парт'ячэек.

Практыка чысткі гэтых ячэек паказала, што ня ўсюды арганізацыі былі належна падрыхтаваны да праверкі. Некаторыя арганізацыі не прыцягнулі да падрыхтоўкі ўвагі шырокіх мас працоўных. Ня ўсе ячэйкі ў належнай меры ўцямілі важнасьць і задачы правадзімай чысткі.

У падрыхтоўчай рабоце да чысткі савецкіх ячэек мы маем аналёгічны малюнак. Некаторыя савецкія ячэйкі дагэтуль яшчэ ня ўцямілі задач, якія стаяць перад імі ў сувязі з чысткай.

Шмат ячэек думаюць, што падрыхтоўка да чысткі абмяжоўваецца вывешваньнем красамоўных плякатаў, лёзунгаў, скрынак для заяў, зьбіраньнем матар'ялаў на асобных камуністых.

Так разумець падрыхтоўку да чысткі нельга. **Праверку трэба увязаць з усёй работай партарганізацыі і праводзіць яе з пункту гледжаньня таго, наколькі кожны член партыі і ўся ячэйка праводзіць клясавую лінію ў штодзённай працы.**

Адна з галоўнейшых задач падрыхтоўкі да чысткі—**прыцягненьне да праверкі савецкіх ячэек шырокіх мас рабочых ад варштату.**

Кожная савецкая ячэйка павінна мабілізаваць увагу вакол праверкі сваіх радоў рабочых з прадпрыемстваў, з якімі больш зьвязана дадная установа (напрыклад, ячэйка Леобеду павінна цесна зьвязацца з рабочымі заводу «Дрэваапрацоўшчык», ячэйка Белхарчтрэсту—з харчовымі заводамі і г. д.).

Яшчэ ў 1926 годзе ЦК УсеКП(б) яскрава адзначыў вялікую ролю партыйнай ячэйкі ў савецкай установе.

Як ячэйка рэагуе на хваравітыя зьявішчы ў рабоце ўстановы? Як кожны камуністы змагаецца з бюракратызмам, цяталінай, расхлябанасьцю, нядбайнасьцю ў апараце? Як змагаецца ячэйка сусроць скажэньня генэральнай лініі партыі?—вось што павінна высьветліць праверка савецкіх ячэек, вось на што павінна быць зьвернута максымум увагі пры падрыхтоўцы да чысткі.

Мы маем рад фактаў замаўчаньня недахватаў у рабоце апарату асобнымі камуністымі і нават ячэйкамі ў цэлым. Ёсьць нямала фактаў, калі камуністыя ўдзельнічаюць у «кругавой паруцы», арганізуюць «блёк маўчаньня» з беспартыйнымі спэцыялістымі.

Возьмем хоць-бы савецкія ячэйкі **Фрунзаўскага і Кастрычнікаўскага раёнаў.** Ці хаця адна ячэйка ўскрыла перад партыяй, перад грамадзкасьцю кворыя бакі ў рабоце свайго апарату? Ці хаця адна савецкая ячэйка заявіла ў райком, ці АК КП(б)Б аб ганебных зьявішчах у сваёй установе?

А мы-ж ведаем, што ганебных зьявішч у нашым савецкім апараце ёсьць нямала. Тут і скрыўленьне клясавай лініі, тут яскрава выначаны правы ўхіл, загніваньне, пратэкцыянізм, падхалімства, цяганіна—тут усё, што хочаце.

Ячэйкі гэтага ня бачаць. Ячэйкі ня ведаюць, што робіцца ў іх пад самым носам. Шырма «благополучия» прыкрывае ўсё адмоўнае, усё хворае ў апараце.

Ёсьць асобныя факты боязьні шырокай самакрытыкі, ігнараваньне апошняй з боку асобных камуністых і ячэек (яч. Наркамасьветы і інш.). Былі выпадкі, калі пытаньні аб чысткі партыі абгаворваліся на закрытых сходах ячэек.

Можна сьмела сказаць, што **не працягу ўсяго лета ячэйкі палец аб палец ня стукнулі для падрыхтоўкі да чысткі.**

У красавіку-маі былі заслуханы даклады аб чысткі партыі, прыняты рэзалюцыі і... на гэтым ячэйкі супакоіліся. Рад ячэек нават не прапрацоўваў яшчэ інструкцыі ЦКК УсеКП(б) аб чысткі.

Маса беспартыйных служачых яшчэ ня ўцягнута ў чыстку. Грамадзкая думка служачых савецкіх устаноў не мабілізавана вакол праверкі радоў КП(б)Б.

Насьцягазэты, якія павінны зьяўляцца баявым рупарам партыйных арганізацый, іх памочнікамі ў стварэньні грамадзкай думкі партыйцаў і беспартыйных служачых вакол чысткі—яны ў падрыхтоўцы да праверкі амаль зусім ня ўдзельнічаюць. Большасьць насьцягазэт абмежавалася зьмяшчэньнем агульных артыкулаў, аўтары якіх няўдала і незразумела паўтараюць сэнс перадавых артыкулаў з цэнтральных і мясцовых газэт.

Штодзённай сыстэматычнай работы няма, канкрэтнай дапамогі ячэйкам у падрыхтоўцы да чысткі насьцягазэты не аказваюць.

Чыстка ўжо не за гарамі, а ячэйкі ўсё чакаюць, пакуль хто-небудзь прыдзе і павядзе падрыхтоўчую работу, чакаюць «націску» в боку райкомаў.

Мы будзем лічыць добра падрыхтаванай да чысткі тую ячэйку, якая, не чакаючы спэцыяльных пануканьняў, сама вядзе штодзённую падрыхтоўку да праверкі.

У канцы дакладу т. Дамброўскі запрапанаваў выступіць і падзяліцца тым, што зроблена асобнымі ячэйкамі для падрыхтоўкі да чысткі.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ т. ДАМБРОЎСКАГА

Спрэчкі падкрэсьлілі лішні раз праўдзівасьць таго, аб чым гаварыў т. Дамброўскі ў сваім дакладзе. Не знайшлося ніводнага прамоўцы, які змог-бы расказаць актыву аб праробленай падрыхтоўчай рабоце. Ні адзін сакратар ячэйкі не знайшоў, чым паганарыцца ў падрыхтоўцы да чысткі.

Выступаўшыя т. т. **Нароенка** (НКЮ БССР), **Селязьнёў** (варта), **Абрамовіч** (пчотачная фабрыка), **Кадушын** (камгас) і **Ашак** фактычна толькі пацьвердзілі, што ўся падрыхтоўка да чысткі зьвялася толькі да дакладаў і рэзалюцый. Больш нічога ячэйкі не зрабілі.

Усе прамоўцы канстатавалі, што маса служачых у чыстку ня ўцягнута, што насьцягазэты зусім слаба ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да чысткі.

Цікавыя факты прывёў у сваім выступленьні сакратар **Фрунзаўскага** райкому КП(б)Б **т. Гурэвіч.**

Белдзяржвыдавецтва. Фабрыка літаратуры. Здаецца, каму як не партыйной ячэйцы БДВ трэба добра ведаць стан нашай літаратуры, праявы правага ўхілу ў ёй, чужыя настроі і г. д. Між тым, іменна ў гэтай ячэйцы ў такіх пытаньнях слаба або зусім не арыентуюцца. Другі факт. Радакцыяй яўрэйскай часопісі «Штэрн» быў зданы ў друк № 8-9 часопісі. У гэтым нумары былі зьмешчаны вершы пісьменьнікаў **Камянецкага і Аксэльрода.** Вершы яўна чужыя, в яўна антыпралетарскай ідэалёгіяй. Затрымалі выпуск часопісі рабочыя друкарні. Дзе-ж былі камуністыя в рэдакцыі? Чаму яны ня ўбачылі ў паказаных вершах нічога дрэннага?

Гэтыя факты выразна сьведчаць аб тым, што ячэйкі ня ведаюць таго, што робіцца ў тэй установе, якою яны кіруюць, што ячэйкі яшчэ слаба ўцямілі дырэктыву партыі аб ролі парт'ячэйкі ў савецкай установе.

Тав. Шмідт у сваім выступленьні прапанаваў стварыць спэцыяльныя камісіі пры райкомах для абсьледваньня работы ячэек і дапамогі праверачным камісіям.

Па думцы т. Гурэвіча гэтую прапанову падтрымаць нельга. Дапаможнікамі праверачных камісій павінны зьявіцца непасрэдна бюро ячэек. Ніякіх дадатковых камісій непатрэбна.

У рэзалюцыі па дакладу т. **Дамброўскага** нарада намецілa мерапрыемствы па паляпшэньні падрыхтоўчай работы да чысткі савецкіх ячэек.

***

Нарада ўшанавала ўставаньнем памяць загінуўшага памкамандзючага Каўкаскай Чырвонаштандартнай армії тав. Фабрыцыуса.

С. Г—н.

„Залатая" рэзалюцыя аднаго акругкому

З аднаго боку—добра, а з другога...

Мы ня маем падстаў абвінавачваць гэты акругком партыі ў недаацэнцы самакрытыкі. Нам думаецца, што ён робіць усё патрэбнае, каб самакрытыка на справе стала **мэтадам работы** партыйнай арганізацыі.

Аднак, будучы ў гэтым упэўненымі, мы тым з большым зьдзіўленьнем задаем сабе пытаньне: **няўжо акругком пабаяўся выразна і рашуча ацаніць становішча аднаго з вялікіх рабочых парткалектываў.**

На такое пытаньне мімаволі наводзіць пратакол гэтага акругкому ад 13 жніўня г. г., вытрымка в якога ляжыць перад намі.

Яна паказвае, што акругком, праводзячы сваё пасяджэньне на даным прадпрыемстве (мабыць, палічыўшы сябе госьцем у ячэйцы) не адважыўся гаварыць сьмелым языком самакрытыкі наконт становішча парткалектыву.

Судзеце самі:

«Маса партыйцаў арганізацыі,—гаворыцца ў рэзалюцыі АК,—**ідэалёгічна ўстойліва** і цьвёрда праводзіць лінію партыі. Побач (толькі побач) в гэтым у арганізацыі ёсьць шэраг настрояў **правага ўхілу** і прымірэнцаў, а яшчэ ў **большай** меры неразуменьне іх сутнасьці і небясьпекі.... Пытаньне аб правым ухіле прапрацавана **недастаткова.** Бюро парткалектыву і цэх'ячэек барацьбе в канкрэтнымі праявамі правага ўхілу **не зьвярталі ўвагі».**

Вось вам «ацэнка» важнейшага пытаньня—барацьбы ячэйкі з правым, найбольш небясьпечным зараз ухілам. Па меншай меры яна вельмі картавая, калі ня больш. Мы задаем акругкому пытаньне: будзьце ласкавы, таварышы, растлумачце, як вы разумееце ідэалёгічную ўстойлівасьць, калі ў большай меры наглядаецца неразуменьне сутнасьці правага ўхілу? **Калі бюро парткалектыву і цэх'ячэйкі не вядуць барацьбы з канкрэтнымі праявамі правага ўхілу ў сваім асяродзішчы.** Зусім ясна, што, прымяняючы формулу: «з аднаго боку добра, а з другога—дрэнна», рэзалюцыя акругкому **не мабілізуе** ўвагі ўсёй масы партыйцаў на барацьбу з правай небясьпекай і нават дэарыентуе яе.

Картавасьць, нерашучасьць ацэнкі працягваецца і па другіх пытаньнях жыцьця і работы парткалектыву.

Найбольш клясычным у гэтым сэнсе прыкладам зьяўляецца ацэнка палітыка-маральнага стану партарганізацыі. Вось яна:

«Партарганізацыя ў масе сваёй здаровая, **хаця** маецца **вялікая колькасьць** хваробных зьявішчаў (пэраг выпадкаў склокі, сямейнасьці, апалітычнасьці, хвасьцізму, рвацтва, сувязь з чужым элемэнтам, моманты п'янства, рэлігійнасьці, антысэмітызму і інш.)». Што можна сказаць пра такое цудоўнае «ўменьне» распазнаваць хваробу. У дадатак да гэтага красамоўнага пераліку, рэзалюцыя гаворыць аб наяўнасьці ў арганізацыі 15-20 проц. пасыўных членаў (амаль балясту), 60 чалавек кандыдатаў са стажам ад 1-5 гадоў. Ці ня ясна, што гэты дыягноз («партарганізацыя здаровая, хаця...») зьяўляецца вельмі эпічным, спакойным, калі ня зусім не верным.

Мы верым таму, што асноўнае ядро гэтага партыйнага калектыву здаровае і адольна праводзіць партыйную лінію. Але яно зможа выканаць сваю ролю тады, калі яму дапамогуць разабрацца ў становішчы, раагарнуць бальшавіцкую самакрытыку снілых зьявішч і элемэнтаў у парткалектыве.

Ці дапамагае гэтаму прыведзеная вышэй ацэнка стану акругкомам? Мы в усёй рашучасьцю запэўняем: не, бо акругком абмежаваўся толькі апісаньнем хвароб, а не іх рашучым лячэньнем. І гэта тады, калі ў рэзалюцыі АК чорным па белым пішацца:

... «як сярод партыйцаў, так і беспартыйных ёсьць **боязнь крытыкаваць,** маюцца спробы **зажыму** і звужаньня рамак самакрытыкі; слаба разгорнута масавая крытыка недахопаў самых мас».

Пасьля гэтага ў нас адпадае апошняе сумненьне ў тым, што парткалектыву патрэбны рашучыя бальшавіцкія меры па аздараўленьні становішча.

Мы на законнай падставе задаем пытаньне: што-ж рабіла ў гэтым напрамку **бюро парткалектыву?** Аказваецца, паводле слоў рэзалюцыі, што **«выстарчальных мер для аздараўленьня ячэйкі яно не правяло».** На простай мове гэта значыць, што бюро парткалектыву **праспала** тыя хваравітыя працэсы, што так разрасьліся ў ячэйцы.

Аднак, рэзалюцыя АК да канца вытрымана ў эпічным стылі: **«недахопы ёсьць, але...»** Перад усёй партыяй, у тым ліку і перад даным акругкомам прайшлі нядаўна вядомая Бакінская справа, справа ячэйкі Дзяржбанку ў Маскве. У абедзьвюх справах партыя падкрэсьлівала, як асноўную прычыну, **забываньне** пра самакрытыку, боязьнь па-бальшавіцку рашуча ёй карыстацца, узбройваць масы гэтай зброяй.

І вось пасьля гэтага на прыкладзе гэтага акругкому мы наглядаем тую-ж боязьнь **рашуча ўскрыць** хваробы вялікай рабочай партарганізацыі і тым самым мабілізаваць масы на перамаганьне хвароб.

Замест гэтага акругком у сваёй рэзалюцыі выбраў «залатую сярэдзіну», чым зьменшыў сур'ёзнасьць стану ячэйкі, не падкрэсьліў рашуча правай **небясьпекі** і небясьпекі мяшчанска-абывательскага вагніваньня, што ўжо захапіла частку членаў партарганізацыі.

АК аказаўся ў палоне ў штампованай рэзалюцыйнай формы, прагледзеўшы тое, як колькасьць недахватаў **перарастае** ў новую, правую якасьць. Трэба проста сказаць, што падобная блізарукасьць і рэзалюцыйны штамп маюць месца ва многіх нашых парткамітэтах і ячэйках. Прыклад «залатой рэзалюцыі» аднаго в акругкому ліпні раз падкрэсьлівае, наколькі шкодна **рэзалюцыйнае аблюйства,** няўзмоцненае самакрытыкай, бальшавіцкім аналізам, сапраўднай мабілізацыяй мас для ажыцьцяўленьня пастаноў партыі.

Такі вывад мы вымушаны зрабіць з тэй рэзалюцыі, якую прыняў даны акругком па дакладу парткалектыву. На пытаньне, пастаўленае намі спачатку: ці ёсьць недаацэнка самакрытыкі АК? —Мы адказваем—**судзеце па прыведзеных узорах.**

Р. КР—СКІ.

Напярэдадні партыйна-навучальнага году

ЗАДАЧЫ ЎЗБРАЕНЬНЯ АРГАНІЗАЦЫІ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКІМІ ВЕДАМІ, ЗАДАЧЫ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ БАРАЦЬБЫ З ЎХІЛАМІ АД ЛЕНІНСКАЕ ЛІНІІ ПАТРАБУЮЦЬ НАПРУЖАНАЙ УВАГІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ПЫТАНЬНЯЎ ПАРТАСЬВЕТЫ

АНТЫРЭЛІГІЙНУЮ ПРАПАГАНДУ—У СЕТКУ ПАРТАСЬВЕТЫ

Разгортваньне сеткі партыйнай і рабочай асьветы па акрузе пачалося ўжо, але яшчэ ня ўсе моманты ўлічаны.

Калі на сходах ячэйкі шмат гавораць аб арганізацыі прафтэхнічнага навучаньня, аб неабходнасьці арганізацыі на прадпрыемстве прыстасаванай да ўмоў працы заводаў школы для малапісьменных, палітшколы і г. д., то ні на адным сходзе ў горадзе яшчэ не паўстала пытаньне аб неабходнасьці арганізацыі на прадпрыемстве антырэлігійнага гуртка. Гэткае-ж зьявішча па ўсіх раёнах.

Між тым, мы ведаем, што ў гэтай галіне зараз ідзе наступленьне клясавага ворага, а вапор яму мы даем не заўсёды належны.

Таму адначасова з разгортваньнем сеткі партасьветы на прадпрыемствах неабходна разгарнуць і сетку антырэлігійных гурткоў. Праграма заняткаў гэтых гурткоў павінна быць разьлічана на ўвесь навучальны год і павінна захапіць ня толькі моманты вывучэньня сутнасьці рэлігіі, але, галоўным чынам, павінна вывучацца канкрэтна, як арганізаваць антырэлігійную працу на прадпрыемстве, на вёсцы, дома і г. д. Гурткі гэтага навучальнага году, такім чынам, па маёй думцы, павінны абярнуцца ў школу падрыхтоўкі актывістых-бязбожнікаў, якія здолеюць разгарнуць працу сярод усіх працоўных.

Праграма заняткаў гэтых гурткоў ужо распрацавана, але тут мы сустракаемся з фактам адсутнасьці належнай колькасьці падрыхтаваных прапагандыстых-антырэлігійнікаў. Гэты прабел у гэтым-жа годзе трэба запоўніць наступным чынам: ЦП саюзу працаўсьветы мусіць правесьці вялікую работу сярод настаўніцтва гораду і вёскі, асабліва прыродазнаўцаў, давесьці яму, што лепшым удзелам у грамадзкай рабоце зьяўляецца работа ў антырэлігійных гуртках. Акруговаму савету саюзу бязбожнікаў трэба стварыць сэмінары для падрыхтоўкі гэтых таварышоў, дзе прапрацаваць пытаньні: паходжаньня рэлігіі і практычна як праводзіць працу ячэйкі СБ.

Па раёнах раённыя саветы СБ пры сакзейнічаньні РК КП(б)В павінны правесьці сіламі прапагандыстых і сіламі саміх ячэек, **як апошнія практычна ўдзельнічаюць у жыцьці прадпрыемства.**

Толькі пры такой пастаноўцы працы магчыма будзе сапраўды разгарнуць сталую антырэлігійную работу і даць рашучы адпор клясаваму ворагу на гэтым вучастку нашай барацьбы.

П. В.

За грунтоўную прапрацоўку пытаньняў марксыцкае тэорыі

(Патрэбен 3 гадовы курс навучаньня ў ВСПШ)

Усякі ўхіл ад ленінскае лініі сустракаў у нашай партыі рашучы адпор, гэта паказвае значны палітычны рост партыі. Але ў партыю і камсамол кожны дзень уліваюцца новыя кадры, мала падрыхтаваныя, і зрабіць так, каб яны добра ўсьвядомілі ленінскую тэорыю,—гэта вялікая задача.

Зразумела, што партвучоба павінна даць ня толькі тэарытычныя веды, але і дапамагчы зьвязаць тэорыю з практыкай штодзённай барацьбы рабочае клясы за выкананьне ленінскіх ідэй, за выкананьне пляну пабудовы сацыялізму.

Выходзячы з гэтага, трэба зрабіць так, каб асноўная маса партыйцаў мела закончаную сярэднюю партадукацыю, бо ня ўсе партыйцы маюць магчымасьць вучыцца ў камвузе, а закончаную сярэднюю адукацыю можа толькі даць 3-гадовая ВСПШ. Яна дасьць магчымасьць прапрацаваць асноўныя марксыцкія веды, дасьць магчымасьць зьвязаць іх з штодзённым жыцьцём.

Практыка паказала, што бяз грунтоўнай прапрацоўкі ў школе курсу па гісторыі клясавай барацьбы надта цяжка вывучаць іншыя курсы, а ўводзіць куро гісторыі клясавай барацьбы пры двухгадовым навучаньні нямэтазгодна.

Тав. І. В. на старонках «Зьвязды» выказваецца за нямэтазгоднасьць 2-гадовага курсу ВСПШ, але нічым сваіх довадаў ня ўгрунтоўвае і абмяжоўваецца толькі крытыкай Эрэнбурга, дый крытыка яго таксама занадта «рэдзенькая», каб яе прыняць пад увагу.

А. ЦЫРУЛІК.

Абгаворым праект арганізацыі дому партасьветы

Праект арганізацыі дому партасьветы замест партклюбу вацьверджаны вусім свячасова. Жыцьцё паказала, што, папершае, адрываць члена партыі ад свайго прафсаюзнага клюбу нямэтазгодна; падругое, перагружанасьць партыйцаў не дае ім магчымасьці прымаць удзел у розных гурткох і ў выніку члены партклюбу толькі плацілі членскія ўзносы і больш нічога. Больш таго, нават праўленьне клюбу за апошні год ні разу не сабралася.

Але рэарганізацыя назвы патрабуе рэарганізацыі форм працы, між тым да гэтага часу ніхто ня выказаўся на гэту тэму. Дом партасьветы павінен быць асяродкам партактыву, дзе таварышы адначасова з работай па павышэньні свайго тэарытычнага ўзроўню змаглі-б добра адпачыць. Якім-жа гэта чынам зрабіць?

Папершае, для паляпшэньня абслугоўваньня наведвальнікаў дому партасьветы трэба арганізаваць вялікую чытальную залю, у якой можна было-б атрымаць увесь ня толькі пэрыядычны друк, але і замежны матар'ял. Бібліятэка павінна выдаваць да хаты толькі выключна бэлетрыстыку і агульнага зьместу. Зусім трэба спыніць выдачу палітычнай, вучэбнай і навуковай літаратуры. Унутраная-ж праца бібліятэкі павінна быць пабудавана такім чынам, каб таварыш мог прыйсьці і зрабіць заяўку на тую ці іншую тэму, а бібліятэкар мог-бы раіць найлепшую кнігу для вывучэньня гэтай тэмы. У гэтай справе бібліятэкар павінен быць падпарадкаваны партбібнэту.

Падругое, як лепш абслугоўваць таварышоў, якія займаюцца самаадукацыяй у сетцы партасьветы, ці стварэць для іх габінэты па дысцыплінах, накшталт навуковай бібліятэкі, або па галінах працы, напрыклад, тых, якія ёсьць у школе па партасьвеце, па самаадукацыі, для прапагандыстага арганпартпрацаўніка і інш. Калі першы варыянт (габінэты па дысцыплінах) мае сваім дадатным бокам тое, што кожны будзе ведаць, у якім габінэце ён павінен працаваць, дык у ім ёсьць тыя недахопы, у якім габінэце ён павінен працаваць, дык у ім ёсьць тыя недахопы, што тыя, якія займаюцца на некалькіх дысцыплінах, асабліва слухачы СПШ і вячэрняга камвузу, павінны будуць пераходзіць з габінэтаў у габінэт. Апрача гэтага, гэтым габінэтам будзе занята ўсё памяшканьне і іншым актывістым недзе будзе працаваць.

Павінна таксама быць абгаворана пытаньне, у якія гадзіны адкрываць бібліятэку. Дом працуе цэлы дзень, удзень у ім працуюць групы СПШ дзённыя і зьменныя некаторых прадпрыемстваў, а ўвечары ён адкрыты для наведвальнікаў, а з бібліятэкай, што рабіць, невядома. Далей, як арганізаваць работу, як не прыстасавацца да таго, каб жанчына-партыйка, прышоўшы ў дом партасьветы, змагла спакойна працаваць? Пры доме арганізоўваецца дзіцячы пакой, у якія гадзіны ён павінен працаваць, таксама невядома

У доме арганізуюцца пэрыядычныя лекцыі. Наперадзе, магчыма, што ў каго-небудзь ёсьць вусім новыя прапановы аб рабоце дому.

Партактыў павінен выказацца на старонках друку, бо гэта новае пачынаньне ва ўмовах Беларусі, і без актыўнага ўдзелу ўсяго актыву не апраўдаюцца тыя вялікія сродкі, якія выдаюцца на ўтрыманьне дому.

В.

Трохтыднёвік партасьветы

У Гомелі пачалася кампанія вярбоўкі партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных рабочых у палітшколы. Для таго, каб больш насьляхова яна прайшла, акругком партыі пастанавіў правесьці ў акрузе трохтыднёвік парт. і агульнай асьветы.

На адкрытых партсходах у горадзе і на вёсцы будуць абгаворваны задачы масавай партасьветы. У калгасах і саўгасах гэтае пытаньне будзе стаяць на бліжэйшых сходах.

***

«Бабская вайна»

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Чацьверты нарыс аб сацыялістычным спаборніцтве на фабрыцы «Гэрой Працы» асьвятляе асьвятляе самае вострае актуальнае пытаньне нашага прамысловага будаўніцтва—пытаньне аб якасьці прадукцыі і зьмяншэньні браку. Практыка сацыялістычнага спаборніцтва дае шматлікія прыклады «ножніц» паміж прадукцыйнасьцю працы і якасьцю прадукцыі. «Колькасьць ці якасьць», «якасьць ці колькасьць»—так часта ставіцца пытаньне ня толькі ў адсталых пластох рабочае клясы, але і ў асяродзішчы адміністрацыйных і тэхнічных сіл нашага прамысловага апарату. Так ставілася пытаньне і на фабрыцы «Гэрой Працы», дзе вялізны рост прадукцыйнасьці працы ішоў побач са значным павялічэньнем процанту браку. Але на «Гэрої Працы» пачынаюць перамагаць другія тэндэнцыі—тэндэнцыі да «новага сынтэзу», да **влучэньня высокай прадукцыйнасьці працы з высокай якасьцю тавару.** *Нарыс малюе вайну за якасьць паперы, за рашучае зьмяншэньне браку—вайну, якую пачалі работніцы паккамэрнага цэху. самага адсталага цэху фабрыкі.*

Рэдакцыя

У паккамэры ўсё белае, сьцены, матавыя лямпы, папера, хусткі і блюзкі работніц. Толькі рукі—дзесяткі, сотні пар рук—мільгаюць у гэтай малочнай сьляпляючай пене, як лыжнікі па схілах асьнежаных гор.

Чорныя ад сонца і ліха рукі нажылых работніц з цёмна-сінімі кусьцікамі вен; гібкія залацістыя рукі дзяўчат-фізкультурніц; рукі жорсткія і мяккія, вялыя і сухія—дзесяткі, сотні пар рук—яны ўзьлятаюць і апускаюцца, узьлятаюць і апускаюцца ў бясконцым і пяўхільным руху... Рукі хапаюць «дзяльню» паперы, стукаюць цьвёрдымі краямі аб дошку стала (гэта называецца «стакануць паперу»), потым прычэпаюць «дзяльню» і распускаюць не... Белая стопка паперы ляжыць у руках работніцы, як курыца ў руках гаспадыні, калі тая, толькі што купіўшы, перакладвае птушку з рукі ў руку і разьдзьмухвае кволы пух, агаляючы ружовае курынае цела.

У паперы таксама цела—і на гэтым целе трэба адшукаць пільным вокам і касьця «рубцы» і тонкі парэз «гарэлага», і сьветлую пляму «вераб'я», і яшчэ многа такіх таемных і небясьпечных рэчаў, якія і вызначаюць тое, што адукаваныя людзі называюць «якасьцю прадукцыі». Сартавальшчыца павінна адабраць брак і раскласьці паперу па сартох—першы, другі і трэці разбор. Яна павінна разьвіць максымальны тэмп працы (вытворчы цэх гоніць 53 тоны паперы ў суткі) і ў той-жа час не прапусьціць браку, выцягнуць усе напісаныя і кароткія лісты, усю «рознавесіцу» і «рознакаляровіцу»... Паспрабуй—ня выцегні! Паспрабуй прапусьціць брак! Вы-ж ня ведаеце, што такое «нумар». А кожная сартавальшчыца ўкладвае ў гатовую партыю паперы такую штуку:

САРТАВАЛЬШЧЫЦА №.....

У выпадку, калі знойдуцца напісаныя лісты ці будзе недахват,—просьба вярнуць гэтую пісульку і растлумачыць прычыну звароту.

Добруская фабрыка
«Гэрой Працы».

Гэта і ёсьць нумар. Зразумела, што нікоў ня хочацца ўбачыць свой «нумар»; зноў з рэзкай атэстацыяй якога-небудзь выдавецтва. Трэба напружваць зрок, трэба швыдкім спрытным рухам выцягваць «гарэлае», трэба не паблытаць першага і другога разбору і ў трэці разбор не палажыць браку. «Шмаргай ці цягай»; як гавораць у паккамэры. Гэтыя два словы азначаюць вечнае напружаньне, вечны нахіл галавы і скаканьне рук... Шмаргай ды цягай, шмаргай ды цягай, хутчэй, хутчэй, глядзі, цябе ўжо абагналі таварышкі.

Брак быў адвечным праклёнам паккамэры. Больш браку—менш выпрацоўкі. Праўда, адміністрацыя даплачвае да сярэдняга заработку, але-ж хіба гэта работа. «Нам ня трэба, каб нам фабрыка даплачвала, мы сваё можам зарабіць»—гаварыла на рабочым сходзе вострая на язык **Каця Цімошкіна**, і ўся паккамэра гаварыла яе вуснамі. І таму, калі фабрыку з усіх канцоў ахапіла полымя сацыялістычнага спаборніцтва, калі норма выпрацоўкі пераскочыла намечаныя 45 тон і пачала дасягаць рэкордных, нячуваных лічбаў, калі адначасова стаў расьці брак і паккамэр закупорылася, не пасьпяваючы за вытворчым цэхам,—тады паккамэра ўзьняла крык, злосная і горкая лаянка палілася на адрасе «спаборнікаў» і адміністрацыі:

— Можа гэтае спаборніцтва карысна для дзяржавы, для кіраўнікоў, а для нас гэта ўбіца... Ну куды нам з такой **брачлівай** паперай.

— Мы ўжо на сябе здохі просім ад гэтага жыцьця. Хіба можа паккамэра зраўняцца з вытворчасьцю. У яго, у мужыка, усё запісваецца, а ў мяне вунь колькі браку!..

— Ужо так працуем, што скура—і тая лопае, а ня толькі папера... А ноч маленькі, прыдзе і ня ведаеш, як рукі палажыць: і так паложыш—баліць, і так паложыш—баліць... **Даюць там спаборнікі вашы на ўсе застаўні, а мы аддуваемся.**

* * *

Выходзіла так, што і тут, на фабрыцы, «бабе» зноў прыходзіцца «аддувацца» за «мужыка», што «мужык» там, на вытворчасьці, робіць сабе, што хоча, зарабляе колькі хоча, а «баба» павінна гнуць карак і маўчаць... Гэта была тыпова-бабская думка, думка старой паккамэры, дзе работніцы прасталялі за доўгімі дрыўлянымі сталамі па тры-чатыры дзесяткі год і ніколі нічога ня ведалі ў жыцьці акрамя гэтага стала, свайго майстра, сваёй хаткі і свайго гароду. Работніца такога тыпу не магла інакш адносіцца на першых парах да сацыялістычнага спаборніцтва. Увесь лад яе хатняга жыцьця, яе мінулае, яе невасёлае сучаснае з штодзённым клопатам аб абедзе, аб бяльлне, аб крэдыце ў ЦРК (у Добрушы няма грамадзкай пральні, а наапэрацыйная сталоўка не спраўляецца і з халастой публікай)—усё гэта выхавала апалітычнага пасыўнага чалавека і недарма іменна тут, у паккамэры, магла ў свой час карыстацца посьпехам рэлігійна-антысэміцкая агітацыя манашак.

Паккамэрны цэх лічыцца самым адсталым цэхам фабрыкі, і толькі цяпер, у кіпучую палаву сацыялістычнага спаборніцтва, у паккамэры павеяла новым ветрам. Тон пачынаюць задаваць другія людзі—отрыжаныя «наброды» з дзіцячых дамоў, камсамолкі-фізкультурніцы, выпускнікі фабзавучу. Да гэтых новых людзей, якія ў перапынак чытаюць газэты, а пасьля пяці бягуць на баскэтбольную пляцоўку ці ў клюб на сход,—да іх цягнуцца і некаторыя з старых... Цётка Галя—таварыш **Аўраменкава**, цётка Алена—таварыш **Міжокіна**, якраз з тых старых, што ідуць за маладымі. Пра іх у паккамэры гавораць, што яны **«прысьвяцціліся»**. Гэта значыць, што цётка Галя і цётка Алена парвалі з тым справедлым глухім добрускім бытам, які рабіў з работніцы тупую пакорлівую нявольніцу... Гэта значыць, што ў цёткі Галі і ў цёткі Алены зьявіліся нейкія новыя інтарэсы, акрамя інтарэсаў свайго стала і свайго гароду.

Так, у іх зьявіліся новыя інтарэсы. І, перш за ўсё, гэта быў інтарэс да вытворчага жыцьця ўсёй паккамэры. Фабзавучніцы і камсамолкі гаварылі, што толку мала ад таго, што ляць адміністрацыю і «мужыкоў-сараўнавальшчыкаў», што гэтым браку не паменшыць, што трэба самім нешта рабіць, Аўраменкава і Міжокіна адчулі ў гэтых словах праўду. Але як рабіць?.. Што рабіць?

* * *

А стаповішча з бракам было сапраўды сур'ёзнае. За ліпень агульная колькасьць браку па ўсіх цэхах фабрыкі дасягала 18 проц., тады як толькі ў маі яго было 13¹/₄ проц. Недалёкія людзі адразу спужаліся гэтай лічбы і закрычалі—«назад». Гэтым людзям была незразумела дыялектыка разьвіцьця. Яны не разумелі, што павялічэньне браку пры такім шырокім росьце прадукцыйнасьці працы было няўхільнай на першых парах супярэчнасьцю, і што ўвесь сэнс сацыялістычнага спаборніцтва заключаўся ў тым, каб перамагчы гэтую супярэчнасьць, і, захаваўшы новы тэмп, дабіцца сапраўднага паляпшэньня якасьці паперы.

Лягчэй за ўсё было вярнуцца назад, да рабскага тэмпу працы, раз назаўсёды адмовіўшыся ад усякіх «спаборніцтваў». Іменна так прабавалі ставіць пытаньне гэтыя недалёкія, рэакцыйна-настроеныя людзі. Яны былі і сярод адміністрацыі, і сярод інжынэраў, і сярод рабочых. Ідэя тут была агульная, хоць яна выражалася розным манэрам. Майстар **Фёдараў**, ці адміністратар **Сурнін** асьцярожна і далікатна гаворадь па тэхнічнай нарадзе, што магчыма **«ці колькасьць, ці якасьць»**, што, зразумела, спаборніцтва—добрая рэч, але... выбачайце... наконт якасьці ня прыходзіцца гаварыць пры выпрацоўцы ў 52-53 тоны... Так гаварылі адміністратары ў тэхнічнай канторы, а ўнізе ля варштатаў і машын ужо пусьцілі чутку аб адступленьні: «пераключайся на другі кантакт», «варочай назад аглоблі»... Сярод рабочых ужо ўспаміналі **«добрую гістарычную пагаворку: цішэй едзеш—далей будзеш»** (чамусьці ўсе напіралі на тое, што пагаворка гэта «гістарычская»).

Патрэбен быў хуткі і рашучы адпор гэтым настроям. Патрэбна была новая вайна—вайна і за колькасьць, і за якасьць, **асабліва за якасьць.** Патрэбны былі людзі, якія-б штурханулі да новага ўздыму, якія-б выступілі пачынальнікамі новага спаборніцтва—**спаборніцтва па лепшай якасьці прадукцыі.** І такія людзі знайшліся: гэта былі перадавыя работніцы паккамэры.

* * *

Пачалося з таго, што канфэрэнцыя работніц, якая адбываецца няпярэдадні першага жніўня, кідае выклік ад імя паккамэры ўсяму вытворчаму цэху на сацыялістычнае спаборніцтва. Канфэрэнцыя канстатуе павялічэньне процанту браку, а таксама другога і трэцяга разбору за лік першага. Акрамя таго,—гаворыць рэзалюцыя,—папера мае многа гарэлых і кароткіх лістоў, слаба глянцуецца, ёсьць закладкі, рубцы і маршчыны, а таксама пападаецца сырая папера ды вялікі процант рознавесіцы. Гэтыя недахопы ўплываюць на прадукцыйнасьць працы работніц у паккамэры, на іх заработак **і не даюць магчымасьці праводзіць сацыялістычнае спаборніцтва.** А таму работніцы выклікаюць рабочых вытворчага цэху на зьніжэньне вышэйпаказаных дэфэктаў.

На той-жа канфэрэнцыі, пасьля прынятьня рэзалюцыі, бярэ слова цётка Галя—таварыш Аўраменкава—і кажа:

—Я то скажу, таварышы, што рукі адпадаюць... Мучымся, мучымся—і ні чорта. Мы-ж гэта пры добрай паперы 5 палок давалі, а цяпер ледзь два палкі даём... Дык я прапаную, **каб паставілі нашых жанчын па машын і каб яны сачылі за якасьцю.**

Гэта была ідэя! Канфэрэнцыя ацаніла прапанову цёткі Галі і ўнесла ў рэзалюцыю яшчэ адзін пункт аб **«патрулёх работніц на вытворчасьці».** Але прапанова так-бы і не пайшла далей гэтай рэзалюцыі, калі-б за яе не ўчапілася камсамольская ячэйка паккамэры на чале з худзенькай «набродай», дасьціпнай **Волай Лукашук.** Уся ячэйка і Воля асабліва вострa адчулі, што «патрулі» цёткі Галі—тая і ёсьць тое зьвяно, за якое, узяўшыся, можна пацягнуць увесь ланцуг. Адпрацаваўшы сваю зьмену, Воля доўга бегала па паккамэры з алоўкам і блёк-нотам у руках, падбягала да работніц, шушукалася і нешта запісвала... Гэта была падрыхтоўка да ваенных падзей, мабілізацыя ўсіх рэзэрваў.

І раптам — бах!.. Здарылася нешта сапраўды нячуванае ў гісторыі Добрушу. «Бабы» зьявіліся на вытворчасьці! «Бабы» хадзілі між машын і рэзак, сьмела бралі лісты паперы і глядзелі яе прасьвет, мацалі стопы, рабілі заўвагі, клікалі майстра і нешта яму паказвалі, нават запісвалі нешта ў блёкнотік — наогул, вялі сябе ў вышэйшай ступені незалежна і нахабна. Ах, чорт пабяры! Мужчыны прабавалі сьмяяцца:

— Жук і жаба прыйшлі і нам паказваюць... ха-ха-ха!

— От жук і раскапаецца ў гэтым г..., давалі сьмяртэльны адпор патрульшчыцы і спакойна рабілі далей сваю справу. Іх прыходзіла па 5-6 чалавек у зьмену (зразумела, у іх нерабочы час).

— Ды што, — зноў наступалі зьбянтэжаныя мужчыны, — мяса без касьцей ня бывае. Што вы хочаце — каб папера без браку зусім была.

— А ты не давай зяўка, не варонь Ляксандра...

— Ня трэба лавіць сойкі з маслам і браку ня будзе.

Бачачы такую цьвёрдасьць і суровасьць, мужчыны мянялі тон:

— А вы што, дзеўкі — кантроль? Мы-ж не віначатыя...

— Знаеце, хлопцы, што — ганеце, як хочаце, а нам дайце **якасьць...** А не, ды к мы патрабуем Рэ-Ка-І: няхай установіць, ці можа так быць.

Патрульшчыцы сапраўды былі добрым кантролем. У адным месцы яны заўважылі, як каландроўшчык неахайна скінуў валік і папсаваў 80 лістоў паперы; у другім — як коса рэзацца папера тады, як гэта лёгка справіць; у трэцім — замест роўнага валіку знайшлі адну «шуму-шуму»... шума-шума — няроўная скамечаная папера. Вось рапарт аднаго з патрулёў:

РАПАРТ

6-га жніўня ў начной зьмене на рэзцы № 1 ішла вельмі моршчаная папера, але пасьля некаторага рэгуляваньня пайшла добрая. На рэзцы № 10 ішлі вельмі дрэнныя валікі і таму была дрэнная і папера: увесь час з аднаго боку маршчына. На каландрах № 8 і валік быў зусім брачлівы, а папера з машыны № 5.

Пушкарова, Лукашук, Янкевіч.

Адна з важнейшых прычын посьпеху патрулёў была ў тым, што яны фармаваліся правільна: разам з двума-трыма старымі работніцамі **абавязкова ішла фабзавучніца, якая добра ведала вытворчасьць.** Акрамя таго, патрульшчыцы цягнулі за сабой майстроў і адміністратараў. Усё гэта мела акрамя свайго чыста-практычнага значэньня, і вялізнае **псыхалёгічнае** значэньне: рабочыя мімаволі пачыналі аглядвацца вакол сябе і пільней сачыць за работай... Якая ганьба атрымаць заўвагу ад «бабы»! А яны могуць заўважыць. З імі нешта робіцца такое, чаго ніколі ня было!..

* * *

«Бабская вайна» ўскалыхнула ўсю фабрыку. За першымі патрульшчыцамі —**Аўраменкавай, Міжокінай** (цётка Алена праявіла асаблівую актыўнасьць і проста хапала за рукаў неахайных і нясумленых рабочых і з крыкам цягнула да майстра) і **Пушкаровай** пацягнуліся дзесяткі другіх. У волі бесьперастанку запісваліся добраахвотніцы і сярод гэтых добраахвотніц была не адна і ня дзьве з тэй катэгорыі адсталых і цёмных работніц, аб якіх мы казалі вышэй. Жывая, зразумелая і блізкая справа адчыніла нейкія тугія клапаны ў душах людзей і яны ахвотна згаджаліся прыйсьці пасьля абеду на фабрыку і аддаць свае вольныя тры-чатыры гадзіны агульнай справе.

Паккамэра зрабіла пачатак. А ўжо тэхнічная нарада дэтальна абмяркоўвае пытаньне аб якасьці прадукцыі і памяншэньні браку. Аказваецца, што можна правесьці цэлых **35 прасьцейшых практычных мерапрыемстваў** у гэтым напрамку. Можна прыняць меры да правільнага захаваньня матар'ялу на складах; устанавіць дакладны вучот паданага матар'ялу; палепшыць перавозку паперы; строга сачыць за правільнай зарадкай, кампазыцыяй і кансыстэнцыяй; зьніжчыць рознакаляровіцу; наладзіць лепшае абслугоўваньне вытворчасьці мэханічнай майстэрняй, дзеля чаго ўвесьці непарыўны рытм тыдзень; адрамантаваць вагонкі і паркеты; увесьці пэрсанальную адказнасьць каландроўшчыкаў за якасьць іх прадукцыі, якр эта практыкуецца ўжо з сетачнікамі (ярлычкі)... І яшчэ многа такіх прасьцейшых і карысьнейшых рэчаў можна зрабіць, каб палепшыць якасьць паперы... Раней аб гэтым чамусьці не думалі.

Ня толькі тэхнічная нарада займаецца гэтым пытаньнем. Ужо збіраюцца і шумяць заснуўшыя вытворчыя нарады рабочых і сетачнік **Юрчык**, патрасаючы кулаком, заяўляе:

— Ёсьць рабочыя, што пускаюць сьліну. Гавораць, што пры Стульгінскім было 5 проц. браку, а цяпер ужо што робіцца... Мы гэтым сьліньком сьліну вытрам. Мы гаворым, што пры **такой** выпрацоўцы **можна** панізіць процант браку. І мы панізім! Той, хто хныча, таго разбудзім. Мы **павінны**, таварышы, панізіць брак.

Гэту задачу ставіць перад намі ня трэст і ня Арид, а наш урад, мы самі... І гэта было самае галоўнае: **«мы самі».**

МІХАСЬ ГОЛЬДБЭРГ.

Камсамолкі і беспартыйныя маладыя работніцы, якія першыя ў паккамэры выступілі ў сацыял. спаборніцтва



Ганна Шараева, камсамолка-спаборніца, павялічыўшая штодзённы выраб сшыткаў на 1500 штук

1-га верасьня выпуск чырвоных камандзіраў АБВШ

Сьвежыя кадры каманднага складу ўліваюцца ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі

За падрыхтоўкай да выпускных іспытаў.

Ад слоў да справы

Калі абгаворваліся д[illegible] аб сацыялістычным спаборніцтве паміж разьдзеламі школы, сярод некаторай часткі курсантаў меліся такія настроі: «Усё застаецца толькі на паперы, бо нельга таго выкаваць, што напісана ў дагаворы». Асабліва такія настроі меліся сярод курсантаў падрыхтоўчае клясы.

Аднак, зараз пункты дагавору ў сваёй большасьці праведзены ў жыцьцё. Напрыклад, пункт дагавору аб **выкананьні практыкаваньняў** са стрэльбаў на 90 проц., з кулямётаў на 80 проц.—у агульным выкананы. Паменшыліся дысцыплінарныя пакараньні. У адносінах культурна-бытавых школа стала вышэй. Камандаваньнем адзначана, што якасьць тактычна страявых заняткаў палепшылася, бо курсанты, прызначаныя па пасады малодшага і сярэдняга каманднага складу, да заняткаў лепш рыхтаваліся. Зброя трымаецца чыстаю, хаця на чыстку часу не павялічана. І ўсё гэта ў выніку сацыялістычнага спаборніцтва. Тых настрояў, якія меліся у[illegible]ну, у курсантаў няма.

Як нелахоп, трэба адзначыць, што штаб спаборніцтва толькі падлічвае вынікі спаборніцтва, але ня выносіць іх у масу.

Патроўскі.

Працоўны дзень курсантаў

Навучальны год курсанта ў школе падзяляецца на два пэрыяды: зімовы і летні.

У зімовы пэрыяд працоўны дзень курсанта пачынаецца з сямі гадзін раніцы. Пачуўшы сыгнал ражка і разам з сыгналам голас днявальнага «падымайся», усе курсанты хутка ўстаюць, адзяваюцца, засьцілаюць ложкі.

Праз пяць хвілін пасьля пад'ёму—зарадка, якая цягнецца 15 хвілін. Усе курсанты выходзяць на двор і пад кіраўніцтвам інструктароў в курсантаў старэйшае клясы займаюцца гімнастыкай, пяюць песьні або проста строем ходзяць па двары.

Пасьля гэтага пачынаецца самаабслугоўваньне: умываньне, чыстка ботаў, прывядзеньне ў парадак рэчаў у тумбачках і іншае. Далей—раніцні агляд, гэта значыць, малодшы каманды склад аглядае зброю курсантаў, адзеньне, чыстату рук і ботаў, тумбачкі і ўласныя рэчы курсантаў сваіх аддзяленьняў.

Потым гарбата.

Апошні раніцні сыгнал—гэта на заняткі. Узяўшы з сабою сшыткі і іншыя патрэбныя рэчы, усе ідуць у навучальную часьць. Сыгнал ражка ў памяшканьні курсантаў і электрычныя званкі ў навучальнай часьці праз кожныя 45 хвілін з пачатку і да канца заняткаў абвяшчаюць перапынак.

Так праходзіць 5-6 гадзін у дзень, пасьля чаго навучальна-страявыя заняткі: вывучэньне сваёй і чужаземнай зброі, статутаў, навучаньне строю, страляніна ў піры са стрэльбаў і кулямётаў.

А 12 гадзіне сьнедаюць, а 16 гадзіне полудзень і потым «мёртвая гадзіна»—паўтары гадзіны сну. Гэтым заканчваюцца школьныя заняткі і па скончэньне «мёртвай гадзіны» пачынаецца пазашкольная праца.

З 18 і да 20 гадзін—праца гурткоў пры клюбе і ленкутках. З пачатку навучальнага году намячаецца, якія гурткі будуць працаваць, вылучаюцца кіраўнікі гурткоў, вызначаюцца дні і месца заняткаў для кожнага гуртка, пасьля чаго запісваюць курсантаў у гурткі.

Пасьля вячэрняй гарбаты—2 гадзіны самастойнай прапрацоўкі курсантамі тых дысцыплін, па якіх хто адчувае сябе слабаватым. Да гэтага часу ў навучальную часьць прыходзяць настаўнікі, выдаюць курсантам падручнікі і дапамагаюць разьбірацца ў незразумелых для некаторых пытаньнях, кожны па сваёй дысцыпліне.

Урэшце,—вячэрняя праверка, пасьля чаго абціраньне да пасьцяліцы халоднай вадой, і роўна ў 23 гадзіны—адбой. Усякае жыцьцё ў школе замірае да раніцы.

І так кожны дзень.

У нядзелю дзень адпачынку. Жадаючыя курсанты ідуць у горад гуляць. Акрамя нядзелі курсанты маюць адпускныя дні сераду і суботу.

Крыху розьніцца працоўны дзень лягернага пэрыяду. Таксама як і на зімовых кватэрах, дзень рэг[illegible]аваны, але замест лябараторый у навучальнай часьці заняткі праводзяцца ў полі. Гадоўнае месца ў летні час займае тактычная падрыхтоўка, практычнае прымяненьне тактычных ведаў на мясцовасьці ў полі. Другім ня менш важным зьяўляецца стралковая і фізычная падрыхтоўка. На заняткох у полі ня чуваць сыгналаў, якія зьяўляюцца знакам пачатку і канца заняткаў і перапынкаў праз кожныя 45 хвілін, час паказвае гадзіньнік камандзіра. Не заўсёды «адбой» і «пад'ём» бывае ў звычайны час. Замест ночы прыходзіцца спаць удзень, а ночу праводзіць начныя тактычныя заняткі. Але ад такой перастаноўкі не зьмяняецца парадак, не скарочваецца па-зашкольны час, у лягерны час, як і ў зімовы, працоўны дзень застаецца ня большым.

Па-зашкольная праца ў летні пэрыяд мае больш пашыраныя формы, футбол, баскетбол, валейбол, плаваньне, кіданьне дзіды, дыску, гранат і іншыя формы спорту ня сьцісьнуты памяшканьнем.

Поле—вялікая прасторная лябараторыя, дзе праходзіць і школьная і па-зашкольная праца курсанта ў летні час.

Р.

Лягерная вучоба школы. Вялікі прывал у паходзе.

Курсант вывучае знарад

Нацработа ў АБВШ

За апошні час у рабоце па беларусізацыі школы ёсьць значны пералом у ленны бок.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі ўстанавілі тэрмін вывучэньня беларускай мовы для тых, хто дрэнна ці зусім ня ведае яе. Як ячэйкі, так і паасобныя таварышы патрабуюць адзін ад другога таварыць на роднай мове. Школьная многатыражная і насьценныя газэты падразьдзяленьняў школы, а таксама і ўся перапіска—выключна на беларускай мове.

Ужо значна больш ужываецца гутарка на беларускай мове на занятках і ў быце.

Аднак, ёсьць яшчэ частка нават партыйцаў і камсамольцаў, якія не зьяўляюцца прыкладам і ініцыятарамі ў справе беларусізацыі.

Ячэйкі часамі таксама слаба павяраюць свае пастановы ў пытаньні беларусізацыі, ня прыцягваюць да адказнасьці партыйцаў за невыкананьне пастаноў. **Ёсьць яшчэ і такія таварышы, якія беларускую мову ведаюць, але не заўсёды ўжываюць яе.**

Наогул-жа можна з упэўненасьцю сказаць, што ў беларусізацыі школы ёсьць значны зрух.

Што асабліва каштоўна, дык гэта тое, што цяпер **штуршкі да ўзмацненьня беларусізацыі выходзяць з самой масы.** Гэта сьведчыць аб тым, што курсанты ўявілі карэнную сутнасьць нацыянальнай палітыкі.

Школьная партыйная арганізацыя, а таксама і камсамольская, аддае многа ўвагі пытаньню беларусізацыі школы, і цэлым радам прынятых практычных мерапрыемстваў шпарка рухае беларусізацыю школы наперад.

БРУЯКІН.

Батарэя нэйтралізавана, домік гарыць

(З баявой вучобы школы)

Гадзіньнік паказвае 14.

З праязрыстага сініга неба сонца ласкае зямлю. Па целе адчуваецца нейкая стома. Тэмпэратура паветра па Ц. 25°. Чуцён сыгнал, і ўсе часьці лягеру «Чырвонае Урочышча» выстройваюцца на пярэдніх лінейках. Медныя трубы духавога аркестру ловяць праменьні сонца, праламляюць іх у сабе і кідаюць ва ўсе бакі бліскуючымі палоскамі.

Мэта пастраеньня была ўжо вядома, і, ня гледзячы на тое, што можна было-б скарыстаць час на адпачынак—усе з узьнятым настроем жадаюць хутчэй рушыцца на артылерыйскі палігон, каб паглядзець некалькі відаў артылерыйскае страляніны, паглядзець уменьне выконваць баявую задачу сваёй памочніцы—артылерыі.

Усе часьці адна за другою выцягваюцца ў доўгі шнур па дарозе. Аркестры іграюць паходныя маршы, разразаюць паветра матывы гармонікаў.

* * *

Вось і палігон. Артылерыстыя з чырвонымі павязкамі на рукавах сустракаюць часьці і паказваюць кожнай вызначанае загадзя і абаткнёнае палкамі месца. Камандзіры часьцей растлумачваюць сваім падначаленым мэту і арганізацыю сёнешняй вучэбна-паказнёной артылерыйскай страляніны. Згодна пляну трэба пачынаць страляць, але яшчэ ня прышлі з Менску асоавіяхімаўскія арганізацыі. Кіраўнікі страляніны нэрвова паглядаюць на гадзіньнікі і на дарогу з Менску. Пачатак страляніны некалькі адцягваецца.

Гарматныя стрэлы прымушаюць усіх прысутных змоўкнуць. Вочы ўсіх накіраваны на першую цэль—агнявую пазыцыю дзьвюх батарэй праціўніка.

Першы знарад падае і падымае стог зямлі каля самых цэляў.

За ім другі, трэці...

Прыстрэлка зроблена і батарэі пераходзяць на паражэньне.

Перш гучныя стрэлы недзе ў тылу, за імі сьвіст знарадаў над галовамі і паўторныя выбухі ля цэляў.

Страляюць хэмічнымі знарадамі.

Батарэі праціўніка нэйтралізаваны.

Адна батарэя вядзе агонь запальнымі знарадамі па дзьвёх асобных цэлях-доміках. Астатнія зьмяняюць пазыцыі.

Вось адзін знарад разарваўся і закрыў дымам домік. Усе прысутныя на назіральнай вышыні аплёдуюць. **Домік гарыць.**

Па сьвістку з акопаў страляюць з кулямётаў і стрэльбаў па праціўніку—мішэнях.

Справа міньгануліся, падымаючы хмары пылу, ездавыя. Гэта батарэя выяжджае на адкрытую пазыцыю для страляньня простаю наводкаю. Не прайшло і 40 сэкунд, а ўжо батарэя распачала беглы агонь.

Заклякаталі кулямёты і пасыпаліся нястройныя стрэлы.

— «У атаку, за мною, ура!».

З акопаў лаваю кінуліся байцы ў контратаку на праціўніка.

З-за горкі выскачылі ездавыя, вядучы па двое коняй з боку—гэта кановоды, якія пакінуты кавалерыстымі для падачы коняй гнацца за адступаючым праціўнікам. Увесь пагілон пакрыты пылам і дымам.

Назіраючы за дзеяньнямі артыпэрыі, захапляешся радасьцю, і расьце давер'е што ў будучым бойках усе роды войск Чырвонай арміі змогуць аб'яднана выступіць супроць ворагаў і паказаць сваю моц.

П—кі.

Ля гарматы.

Наш лепшы

Увага, якая аддаецца тав. **Казлову** ў наш урачысты дзень выпуску, не выпадковая, а заслужаная ім.

Тав. Казлоў—сын селяніна-серадняка. Да паступленьня ў школу працаваў на гаспадарды свайго бацькі і быў адначасова актывістым у вёсцы. У 1924 годзе ён паступіў у камсамол, з 1925 году кандыдат, а з 1928 году—член партыі. Як і большасьць курсантаў, асьвету меў ніжэйшую—першую ступень.

Будучы яшчэ ў вёсцы, быў членам райкому камсамолу, сакратаром вясковай камсамольскай ячэйкі, членам праўленьня каапэрацыі.

У школе таксама Казлова выбіраюць сакратаром ротнай камсамольскай ячэйкі, а потым членам бюро калектыву ЛКСМБ школы.

З працай, якая ўскладалася на яго, як на сакратара ротнай ячэйкі і члена бюро камсамольскага калектыву школы, спраўляўся добра.

Па навучальнай і страявой часьці Казлоў на прапяту 3-х год ішоў упередзе і заняў першае месца ў сьпісе старшынства выпускнікоў.

Старанасьць і добрасумленнасьць Казлова, яго дысцыплінаванасьць ва ўсіх адносінах дапамаглі перамагчы сваю нізкую асьвету.

Вызначаючы першых, Аб'яднаная Беларуская Вайсковая Школа жадае і ў далейшым выпускаць усіх з сваіх сьцен такімі старанными, як Казлоў і другія блізкія яму па старшынстве.

Аграмінімум толькі на паперы

РАЙВЫКАНКОМЫ І СЕЛЬСАВЕТЫ НЯ КІРУЮЦЬ АГРАУПОУНАВАЖАНЫМІ.—САУГАСЫ І КАЛГАСЫ НЯ ВЫКАНАЛІ ДЫРЭКТЫВЫ УРАДУ

Нядаўна скончана абсьледваньне выкананьня аграмінімуму ў большасьці раёнаў Менскай акругі.

Калі ня лічыць праведзеныя ў веснавую сяўбу ачыстку і пратручваньне насеньня і збор попелу, дык выкананьне ўсіх астатніх мерапрыемстваў, прадугледжаных законам ураду і пастановамі райвыканкомаў, бязумоўна не атрымала свайго практычнага ажыцьцяўленьня ня толькі ў сялянскіх гаспадарках, але нават у саўгасах, калгасах і пладовых выхавальніках.

У наведаных саўгасах (Русінавічы, Калініна, Сьмілавічы, Раванічы, Халопенічы і Смалявічы), 3-х калгасах і 5 пладовых выхавальніках наглядаецца засьмечанасьць ня толькі сядзіб, але палёў, гародаў, садоў і выхавальнікаў.

Сапраўднае выкананьне аграмінімуму ў сялянскіх гаспадарках — зьявішча вельмі рэдкае. Абкошваньне межаў амаль нідзе ня выконваецца. Праўда, у асобных сельсаветах назіраюцца выпадкі частковага паляпшэньня сенажацяй і пашы (Бярэзінскі і Барысаўскі раёны). У некаторых сельсаветах забаронена ўборка нясьпелага жыта. Але трэба сказаць, што ўсё гэта толькі асобныя рэдкія выпадкі, а не сыстэматычнае, масавае выкананьне аграмінімуму. З усіх мерапрыемстваў па аграмінімуме, забарона пасьвіць скаціну на сенажацях і рашучая барацьба з патравамі атрымалі ўсё-ж адносна большае практычнае ажыцьцяўленьне.

Але **большасьць мерапрыемстваў па аграмінімуме застаецца пакуль што на паперы.** Закон аб аграмінімуме вельмі мала папулярызаваны сярод сялянства. Райвыканкомы і сельсаветы зусім ня кіруюць работай аграўпоўнаважных. Райвыканкомы не вядуць ніякага кантролю і вучоту выкананьня аграмінімуму.

Дзеля таго, каб гэтую надзвычайна важную справу ў павышэньні ўраджайнасьці найхутчэй пасунуць уперад і дабіцца сапраўднага і поўнага выкананьня ўсіх мерапрыемстваў па аграмінімуме, неабходна, каб РВК у бліжэйшы тэрмін сабралі падрабязныя весткі аб ужытых мерапрыемствах па выкананьні аграмінімуму ў раёнах.

Белсельтрэст і калгассаюз павінны прыняць рашучыя захады да выкананьня аграмінімуму ў сацыялістычным сэктары (саўгасах і калгасах).

Райвыканкомы павінны зрабіць праверку выкананьня аграмінімуму. На асоб, якія зрываюць правядзеньне аграмінімуму, бязумоўна неабходна накладаць адміністрацыйныя спагнаньні і штрафы.

РВК і сельсаветы павінны зараз-жа распрацаваць канкрэтныя пляны правядзеньня мерапрыемстваў аграмінімуму па асобных вёсках і пасёлках, каб выканаць іх у час правядзеньня асеньняй пасеўкампаніі.

Пры прадастаўленьні ільгот па с.-г. падатку за аграмерапрыемствы, трэба ўлічваць наколькі даным паселішчам выкананы аграмінімум, і ні ўякім разе не даваць ільгот тым паселішчам, якія ня выкавалі хаця аднаго мерапрыемства аграмінімуму.

Л. Раўдо.

Па Савецкай Беларусі

15 тыс. руб. на пабудову прафшколы

ВОРША (наш кар.). Пачалася пабудова прафтэхнічнай школы ў Воршы. Да гэтага часу прафшкола зьмяшчалася ў вельмі дрэнным памяшканьні, што перашкаджала нармальнай працы. Белкамунбанк адпускае на гэту пабудову 15 тыс. руб.

Праверка беларусізацыі нізавога апарату

ГОМЕЛЬ (наш кар.). У паасобных раёнах акругі распачалася праверка беларусізацыі нізавога савецкага апарату. 7-га верасьня Гомельскі АВК зробіць даклад на пасяджэньні ЦВК БССР аб ходзе беларусізацыі па акрузе.



Галоўны корпус пабудовы бэконнага камбінату ў Воршы

Магутны ўдар па рэлігійных забабонах

Увядзеньне непарыўнага вытворчага тыдня касуе ўсе царкоўныя сьвяты

Мы жывем у эпоху вялікіх работ. На нашых вачох вырастаюць новыя гіганты-заводы, будуюцца вбожжавыя фабрыкі-саўгасы, вялізныя электрастанцыі, вырастаюць новыя прамысловыя гарады. Зусім мяняецца твар зямлі.

Усё гэта патрабуе перабудовы і нашага быту. З быту трэба выгнаць цемру, навуцтва, адсталасьць, дзікія звычаі і забабоны,—усё, што цягне нас назад. *Рэлігійныя сьвяты цесна пераплецены з старым бытам.* Рэлігійныя сьвяты выклікаюць п'янства і хуліганства. Яны трымаюцца на дзікіх звычаях старасьветчины.

Рэлігійныя сьвяты наносяць вялікую шкоду сацыялістычнаму будаўніцтву. Каляды, масьляна, вялікдзень—усе гэтыя сьвяты нясуць з сабою прагулы, прастоі, псаваньне машын і абсталяваньня. П'янства, абжорства і хуліганства ў рэлігійныя сьвяты наносяць шмат шкоды ня толькі савецкай дзяржаве, але і кожнай рабочай сям'і паасобку. Гэтыя сьвяты суправаджаюцца ўсюды бойкамі, згвалтаваньнямі, забойствамі і іншымі злачынствамі.

Вось чаму ў апошнія гады рабочыя многіх фабрык і заводаў выносілі пастановы працаваць у рэлігійныя сьвяты. На коляды і вялікдзень многія прадпрыемствы дабраахвотна працавалі. Прапанова ленінградзкага рабочага аб адпрацоўцы дня індустрыялізацыі замест «спаса» — 6 жніўня — была падхоплена ўсёй рабочай клясай з вялікім уздымам. 6-е жніўня стаў днём індустрыялізацыі. Зараз рабочыя ўзьнімаюць пытаньне аб адпрацоўцы 2-га дня індустрыялізацыі замест 25-га сьнежня (коляды). Ня раз рабочыя і праз сходы, і праз газэты патрабавалі перагляду савецкага календара в тым, каб адтуль былі выкінуты рэлігійныя сьвяты.

Дэкрэт ураду СССР аб пераходзе на непарыўны вытворчы тыдзень ідзе на сустрэч прапановам шырокіх рабочых мас аб скасаваньні рэлігійных сьвят.

Увядзеньне непарыўнага вытворчага тыдня азначае поўнае зьнішчэньне царкоўных сьвят, як дзён адпачынку і, такім чынам, вялікі ўдар па рэлігійных забабонах.

ЦО «Правда» піша, што дэкрэт аб непарыўным тыдні зьяўляецца самым моцным ударам па рэлігіі за 12 год рэвалюцыі пасьля выданьня дэкрэту аб адлучэньні царквы ад дзяржавы.

Зразумела, што дэкрэт ня зьнішчае ўстаноўленай для рабочых колькасьці дзён адпачынку.

Народны Камісарыят працы вызначыць дні адпачынку ў адпаведнасьці з мясцовымі рэвалюцыйнымі сьвятамі і патрэбамі непарыўнай вытворчасьці.

Разумоўна, дэкрэт ураду будзе з вялікім здавальненьнем спатканы рабочымі масамі Савецкай Беларусі.

Б—ў.

Цэны ў вакзальных буфэтах вельмі высокія

Транспартная каапэрацыя павінна ўрэзаць апэтыты буфэтчыкаў

Наркамгандаль БССР запрапанаваў праўленьням транспартна-спажывецкага таварыства МББ чыг. і Зах. чыг. у тэрміновым парадку перагледзець існуючыя цэны на тавары, што прадаюцца на станцыях чыгунак у буфэтах, і ўжыць рашучыя меры да іх зьніжэньня, раўняючыся прыкладна па цэнах, існуючых у гарадзкой каапэрацыйнай сыстэме.

Апрача таго, ТПТ неабходна ўжыць меры да таго, каб у буфэтах прадаваліся прадметы шырокага спажываньня, агульнадаступныя, а на выключна дарагія.

Акруговым інспэктарам гандлю запрапанавана прасачыць за зьніжэньнем цэн на прадукты, адпускаемыя буфэтамі на транспарце.

Месячнік „за пісьменнасьць"

З 1-га верасьня пачынаецца месячнік «За пісьменнасьць» па Беларусі. Месячнік ставіць сваёй мэтай мабілізаваць увагу грамадзкасьці вакол ліквідацыі няпісьменнасьці, ажыцьцявіць пастановы 16-й партканфэрэнцыі.

У часе месячніку намечана пашырыць сетку лікпунктаў, вербаваць новых членаў таварыства «ПН», мабілізаваць новыя кадры ліквідатараў.

Для правядзеньня месячніку пры ўсіх акруговых і раённых саветах таварыства «ПН» складзены камісіі. Пры гарадзкіх і вясковых ячэйках «ПН» вызначаюцца спэцыяльныя ўпаўнаважаныя.

Будзе арганізаваны вучот усіх няпісьменных і малапісьменных, якія будуць ахоплены лікпунктамі.

Камісіі садзейнічаньня пры сельсаветах правядуць вучот усіх няпісьменных батракоў і прымацуюць іх да лікпунктаў.

Па раёнах і гарадох адкрываюцца курсы, канфэрэнцыі па падрыхтоўцы ліквідатараў.

Будуць праведзены шырокія нарады ўсіх савецкіх, каапэрацыйных і прафэсыянальных арганізацый, прысьвечаных пачатку навучальнага году і культурнаму паходу за пісьменнасьць.

У саўгасах, калгасах і прадпрыемствах будуць адкрыты лікпункты з мэтаю 100 процантнага ахопу няпісьменных рабочых, дапрызыўнікаў, делегатак, калгасьнікаў і саўгасьнікаў.

Эпідэмія брушнога тыфусу ў Менску

Захворваньні зьвязаны з антысанітарным становішчам гораду

У Менску зьявілася эпідэмія брушнога тыфусу. Захворваньні брушным тыфусам наглядаліся ў Менску і ў мінулыя гады, але яны не насілі такога масавага характару. За ўвесь 1927 год у Менску было зарэгістравана 70 выпадкаў захворваньня на тыфус. За апошнія-ж 27 дзён жніўня ў Менску захварэла на брушны тыфус 56 чал. За адзін толькі ўчарашні дзень у больніцу дастаўлена 10 чал. Такой эпідэміі ў Менску ня было ўжо 10 год.

На нарадзе дактароў і прадстаўнікоў навуковых інстытутаў адзначана магчымасьць далейшага пашырэньня захворваньняў праз харчовыя прадукты, сырую ваду і сэльтэрскую. Эпідэмія зьвязана з антысанітарным становішчам гораду — двары забруджаны, асэнабоз перагружаны работай, рынкі ўтрымліваюцца ў нячыстаце, слабы нагляд за становішчам рынкаў, дрэннае абсталяваньне вадаправоду.

Інспэкцыя аховы здароўя прыняла рад мер да ліквідацыі эпідэміі. Скурна-вэнэрычная клініка закрыта, а ложкі яе перададзены для хворых на брушны тыфус. Для гэтай-жа мэты адводзіцца будынак трахаматознай лячэбніцы. Вылучаны спэцыяльныя дактары для штодзённага нагляду за вадаправодам і санітарным утрыманьнем рынкаў. Пры бактэрыялёгічным інстытуце адкрыты пункт для прышчэпак супроць брушнога тыфусу. Прышчэпкі дармовыя. Пункт адкрыты штодзённа.

Інспэкцыя аховы здароўя выпусьціла адозву да насельніцтва аб мерах асабістай прафілактыкі. Па радыё будзе прачытаны рад лекцый па санітарыі.

Учора на пасяджэньні прэзыдыуму гарсавету заслухана інфармацыя доктара Рахоўскага аб захворваньнях на брушны тыфус.

Прэзыдыум гарсавету прапанаваў міліцыі безадкладна прыняць меры да санітарнага аздараўленьня гораду. Домакіраўніцтва павінна рабіць дэзынфэкцыі ў уборных хлёрыстай вапнай. Інспэкцыяй аховы здароўя прапанавана ўзмацніць нагляд за рынкамі.

Страхаваньне ў каапэрацыйнай сыстэме

Каапэрацыйнае страхаваньне заснавана і існуе самастойна (асобна ад Дзяржстраху) з прычыны таго, што яно павінна выконваць ня толькі задачы агульнага страхаваньня, але яшчэ і дапамагаць каапэрацыі.

Каапэрацыйнае страхаваньне пабудавана так, што яно ня мае свайго асобнага апарату. Прадстаўнікі яго (яго агенцтвамі і суб'агенцтвамі) зьяўляюцца саюзы каапэрацыі; ёсьць суб'агенцтвы і пры-куставыя аб'яднаньні калгасаў. Гэтакая арганізацыйная пабудова дае магчымасьць саюзам ня толькі свачасова ведаць аб паваль-най бядзе ў таго ці іншага яго члена, але і прымаць зараз-жа адпаведныя мерапрыемствы арганізацыйнага і фінансавага характару, скажам, у выпадку эпізоты жывёлы ў тым ці іншым калтасе. Дзякуючы гэтай арганізацыйнай пабудове, накладныя выдаткі каапэрацыйнага страхаваньня значна ніжэйшыя за накладныя выдаткі Дзяржстраху.

Сабраныя страхавыя прэміі спачатку захоўваюцца ў каапэрацыйных саюзах, а потым у каапэрацыйным банку, тым самым узмацняецца фінансавае становішча каапэрацыі.

Трэба адзначыць, што каапэрацыйнае страхаваньне стварыла фонд агнятрывалага каапэрацыйнага будаўніцтва.

На чарзе дня стаіць задача **правядзеньня балянсавага страхаваньня па сыстэме вытворчай каапэрацыі.** Прынцыпова пытаньне ўжо вырашана.

Балянсавае страхаваньне забясьпечвае поўную аплату сум страт пацярпеўшай ад тэй ці іншай бяды арганізацыі і тым самым забясьпечвае пляніраванае вядзеньне гаспадаркі кожнай каапэрацыйнай арганізацыі. Пляхам генэральных умоў яно яшчэ шчыльней увязвае ўсе зьвяньні каапэрацыйнай сыстэмы, значна спрашчае афармленьне страхаваньня і зьніжае накладныя выдаткі яго.

Акрамя таго, пастанова СНК СССР ад 4 чэрвеня г. г. прадугледжвае страхаваньне ўсяе маемасьці каапэрацыі ў абавязковым парадку праз сыстэму каапэрацыйнага страхаваньня.

КАРПОВІЧ.

На „каналізацыйныя" тэмы

Вадаканал паклапаціўся аб гігіене нашых кватэр. Згодна дагавору з камгасам (у ліпені г. г.). Вадаканал узяў на сябе задачу абсталяваць каналізацыю ўборных у кватэрах жактаўскіх дамоў па Савецкай і Ленінскай вул. Менску.

Работа, праўда, досыць складаная: трэба зрабіць паводле найноўшай тэхнікі каналізацыю ў дварох, трэба перавесьці вадаправодныя трубы ў кватэры з аднаго месца на другое, раскідаць падлогу і г. д., а рабочай сілы, пачынаючы з цесьляроў і да вадаправодчыкаў, Вадаканал мае ня вельмі многа.

Як усё гэта праводзіцца на практыцы: прыходзяць цесьляры, зломяць падлогу, пячнікі прасякнуць вам сьцяну, а там ужо вадаправодчыкі здымаюць з вадаправоду ракавіну. Усё гэта робіцца за гадзіну. У пакоі ў вас поўны хаос: бярвеньні, каменьні і цэгла. Вадаправодам карыстацца можна, але ракавіна зьнята і вылець брудная вады нельга, прыходзіцца рабіць гэта саматужным спосабам, часта з трэцяга паверху.

Вы чакаеце вадаправодчыкаў, каб закончыць работу ў вашай кватэры, чакаеце дзень-два. Дарма! Праходзіць цэлы месяц, пакуль зьявяцца спэцы з Вадаканалу.

Для будучых выгад варта крыху пацярпець—гэта невялікая бяда.

Але загвазда вось у чым: напрактыкаваныя людзі кажуць, што ўборныя нельга будзе карыстацца ўсю зіму да будучага лета па вельмі простай прычыне.

Помпавая станцыя (куды павінен сьцякаць увесь бруд), якую будуюць за горадам, яшчэ ня скончана і раней лета 1930 г. ня будзе працаваць.

Запытаньне: навошта Вадаканал пачаў заўчасна будаваць тое, чым нельга будзе карыстацца ўсю восень і зіму?

С. ТУРАЎ.

Рэалізацыя пазыкі па Меншчыне

Паводле даных Менакрфа, на 27-га жніўня рэалізавана аблігацый на суму каля 2.925.000 р., што складае звыш 97 проц. заданьня.

Рабочыя, чырвонаармейцы і служачыя далі каля 2.639 тысяч — больш 104 проц. заданьня. Сяляне больш 66 тысяч—26,6 проц. заданьня і вольны рынак — 219 тыс. — каля 92 проц. кантрольных лічбаў.

Сярод сялян праца па рэалізацыі толькі цяпер разгортваецца.

Датэрмінова афармлена (ёсьць ужо першыя ўзносы) каля 295 тыс. руб.

МЕНСК

ЗА ДЗЕНЬ

НОВЫ КРУХМАЛЬНЫ ЗАВОД. Саюз харчавікоў выказаўся за ўключэньне ў кантрольныя лічбы Харчтрэсту на 1929-30 год пабудовы 4-га крухмальнага заводу. Кантрольнымі лічбамі павінен быць прадугледжаны перавод трох дражджавых заводаў на 7-гадзінны рабочы дзень.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ВЫТВОРЧАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ХАРЧАВІКОЎ. 18 верасьня ў Менску склікаецца ўсебеларуская вытворчая канфэрэнцыя рабочых харчавікоў. На парадку дня—кантрольныя лічбы па харчовай прамысловасьці Беларусі на 1929-30 год, аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва і інш. 21 верасьня адбудзецца пленум усебеларускага камітэту саюзу харчавікоў.

РАБОЧЫ-ДЫРЭКТАР ЗАВОДУ. Рабочы дражджавога заводу «Чырвоная Зорка» т. Пятрухін вылучаны на пасаду дырэктара цукернай фабрыкі «Прагрэс».

АБСЬЛЕДВАНЬНЕ КУЛЬТРАБОТЫ. Белбюро гандлёвых служачых вылучыла спэцыяльную камісію для абсьледваньня культработы па раду калектываў служачых Менску. Абсьледваньне скончыцца праз два тыдні.

9.000 р. НА КУЛЬТМАСАВУЮ РАБОТУ НА ВЁСЦЫ. ЦК саюзу будаўнікоў адпусьціў ЦП саюзу 9.000 руб. на культмасавую работу на вёсцы сярод сазонынкаў-будаўнікоў.

Цэнтральная тэхнічная станцыя ў Менску

У зьвязку з XV МЮД'ам ВСНГ прапанаваў трэстам вылучыць камсамольцаў і рабочую моладзь, што выявілі сябе, як прыкладныя рабочыя на пасадзе брыгадзіраў, майстроў, на работу ў тарыфна-нармівочнае бюро і г. д.

ВСНГ выказаўся за арганізацыю ў Менску цэнтральна-тэхнічнай станцыі, якая будзе аказваць тэхнічную і арганізацыйную дапамогу вынаходцам, рацыналізатарскаму руху, а таксама ў павышэньні тэхнічнай пісьменнасьці маладых рабочых.

Дзяржсьпірт не павінен прадаваць дэнатурату

Улічваючы вялікі недахоп у дэнатурацэ, які адпускаецца з крам ЦРК выключна пайшчыкам і ў абмежаванай норме, Наркамгандаль БССР прызнаў намэтазгодным водпуск дэнатурату з крам Цэнтрасьпірту.

Наркамгандлю БССР даручыў праўленьню Цэнтрасьпірту спыніць самастойны продаж дэнатурату з крам Цэнтрасьпірту ў гарадох БССР.

16 ветэрынарных лячэбніц

Па мясцовым бюджэце адпушчана 288.000 р. на пабудову ў будучым годзе ў акругах Беларусі 16 новых ветэрынарных лячэбніц. Апрача таго Белдзяржстрах адпусьціў 72.000 р. на пабудову 8 ветэрынарных лячэбніц.

Рабочых—у загатоўчы апарат

Саюз гарбароў вылучыў 8 рабочых прадпрыемстваў Менску, Віцебску, Гомелю і Магілеву для работы ў загатоўчым апараце Сыроэьпалынату. Кандыдатуры рабочых абгаварваюцца на вытворчых нарадах і агульных сходах рабочых. Саюз харчавікоў вылучае 6 рабочых для ўдзелу ў хлебазагатоўчай кампаніі.

Бухгальтарскія курсы

1 верасьня ў Менску адкрываюцца аднагадовыя бухгальтарскія курсы. Жадаючыя паступіць на курсы павінны мець адукацыю ў аб'ёме сямігодні. Заявы прымаюцца ў разумовай сэкцыі біржы працы.

Дэлегацкі сход вайсковых ячэек МОПР'у

Сёньня, 30 жніўня, у клюбе Чырвонай арміі а 7 гадз. увеч., Менакругком МОПР'у склікае ДЭЛЕГАЦКІ СХОД ВАЙСКОВЫХ ЯЧЕЕК МОПР'у МЕНСКАГА ГАРНІЗОНУ.

На парадку дню—справаздача Менскага Акруговага Камітэту МОПР'у.

Уваход па членскіх білетах МОПР'у.

Запрашаецца гарадзкі мопраўсны актыў.

ПАСЬЛЯ СХОДУ—КІНО.

МЕНАКРУГКОМ МОПР'у.

СУД

Агэнты класовага ворага ў „Белпасрэдніку"

Скончылася судовая справа Ракава і К-о

28-га жніўня, а 12 гадз. ночы суд вынес прыгавор па справе былых кіраўнікоў працкалектыву «Белпасрэднік».

Ракаў і Эйдэльман прызнаны вінаватымі ў тым, што, займаючы пасаду загадчыкаў працкалектыву і клясьнікі магазыну «Белпасрэднік», давялі яго да развалу, мелі сувязь з прыватнымі гандлярамі, прадавалі ім дэфіцытныя тавары. З мэтаю ўтойваньня іх зваротаў ад фінінспэктара выдавалі ім фальшывыя рахункі.

Эйдэльман, займаючы пасаду загадчыка камісійнага магазыну, прысвоіў і растраціў 144 руб. Будучы камандыраваны ў г. Батум для закупкі тавараў, ён самавольна закупіў тавараў на суму каля 11.000 руб. і 10 адрэзаў сукна на 1.900 руб., адаслаў тавары агенту Мінцу, які іх пераслаў у Менск, дзе яны доўга ляжалі непраданымі. Апрача таго, Эйдэльман закупіў партыю тавару ў Батуме і прадаў прыватнікам. Наогул, закупкі тавараў у прыватнікаў складалі звыш 15 проц. агульнай сумы закупак.

Файнштэйн у 1924 годзе судзіўся за растрату і безгаспадарчасьць, у часе работы ў «Белпасрэднік» самавольна зьніжаў расцэнкі на тавары, якія прадаваў сваім знаёмым. Так-сама ён закупіў 200 пуд. масла ў прыватнікаў і прадаў яго ЦРК.

Рыжоў, будучы старэйшым бухгальтарам, прывёў бухгальтэрыю ў хаатычнае становішча, адпускаў служачым авансы на гулянкі.

Ракаў С. Г. прыгавораны на тры гады зьняволеньня з паражэньнем у правох на адзін год. Акрамя таго суд забараніў яму займаць адказныя пасады ў дзяржаўных, каапэрацыйных і грамадзкіх установах на працягу двух год.

Файнштэйн Н. М. — на тры гады зьняволеньня з паражэньнем у правох на 5 год і забаронаю займаць адказныя пасады ў працягу 5-ці год.

Эйдэльман В. Г. — на 6 год зьняволеньня в суровым адмежаваньнем, паражэньнем у правох на 5 год і забаронаю займаць адказныя пасады на працягу 5 год.

Рыжоў — на адзін год і 6 месяцаў. Дуберштэйн — на адзін год зьняволеньня.

Акрамя таго суд забараніў **Файнштэйну** і **Эйдэльману** пасьля адбыцьця пакараньня пражываць у акруговых гарадох БССР і 50 клм. пагранпаласе ў працягу 5-ці год.

Герман, Рудольф, Шац і Фрыдман апраўданы.

Клясавы вораг напомніў пра сябе

Траяноўскі Ўладзімер—вядомы ў г. Віцебску юрысты ў часе царызму — прысяжны паверанны.

У свой час Траяноўскі меў даволі вялікую практыку. У царскіх судох ён гаварыў доўгія прыгожыя прамовы і выклікаў «сьлязу» ў прысяжных засядацеляў, за што атрымліваў вялікі гонарар.

Прышла рэвалюцыя. Траяноўскі страціў сваю клієнтуру. Каб хаця што-небудзь «зарабіць», ён увайшоў у цесную сувязь са злачынцамі і стаў займацца вымаганьнямі, за што быў прысуджаны ў 1923 годзе да 2-х год зьняволеньня. Бачачы, што такая «адкрытая» работа вялікага прыбытку не дае, Траяноўскі апусьціўся «у падпольле» — зрабіўся падпольным адвакатам.

Зноў Траяноўскі зажыў прыпяваючы.

Аднойчы, напіўшыся, Траяноўскі ехаў па галоўнай вуліцы г. Віцебску і, спаткаўшы двух яўрэяў, пачаў крычаць: «жыдоўскія морды», «жыдоўскае царства», «жыдоў біць трэба» і г. д.

Віцебскі акруговы суд прыгаварыў яго да пазбаўленьня волі са строгай ізаляцыяй на два гады, да пазбаўленьня праў на такі-ж тэрмін і пастанавіў выслаць у Янісейскую губ. на тры гады.

Па касацыйнай скарзе Траяноўскага справа яго разглядалася ў Вярхоўным судзе.

Вярхоўны суд зьняволеньне са строгай ізаляцыяй скараціў Траяноўскаму напалову, пазбаўленьне ў правох пакінуў на два гады, а замест высылкі ў Янісейскую губ. забараніў яму жыць у межах БССР на працягу 3-х год.

Што зроблена па лістох рабселькораў

◎ Аршанскім акрвыканкомам узбуджана хадайніцтва перад РСІ аб скасаваньні пастановы прымацаваньня хаты **Ліцьвінава** за Крупскім РВК.

◎ Справа аб несваячасовай ачыстцы насеньня ў вёсцы Тукалаўкі, Прудзішчанскага сельсавету, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, накіравана Менакрвыканкомам акруговаму пракурору **для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.**

◎ Пацьвердзіліся факты аб злоўжываньні на пасадзе загадчыка Горацкага млыну **Кулікова Янкі.** Справа накіравана Аршанскай пракуратурай у акруговы суд **на судовы разгляд.**

◎ Мазырскім гарсаветам адмоўлена ў хадайніцтве гр. Вэйсману аб усынаўленьні ім **Гурбана.** Вэйсманам больш хадайніцтва ня ўзбуджана.

◎ Прохараў зьнят з працы ў спраўдоме ў сувязі з чысткай судовых і пракуратурскіх установ. Полацкая АКК дае даведку, што справа аб **Прохараву,** па абвінавачваньні яго **ў неэтычных учынках** будзе разглядацца пры чыстцы партыі.

◎ Адмоўлена ў рэгістрацыі на Менскай біржы працы гр-цы **Шыпак М.,** як непрацаваўшай па найме ў апошнім годзе.

◎ Дзесятніку Азарыцкага аддзяленьня Лесбелу Сурпіну пастаўлена на від Азарыцкай камісіяй па чыстцы **за грубыя выпады ў часе чысткі партыі.**

◎ ЦП саюзу працаўнікоў папяровай прамысловасьці прапанавала Белпапертрэсту **прыцягнуць да адказнасьці адміністрацыю** кардоннай фабрыкі імя Леніна ў Пухавіцкім раёне **за цяганіну і бюракратызм з выплатай пэнсіі рабочаму** за час яго замены майстра.

Новыя школы фабрычна-заводзкага вучнёўства

Прэзыдыум ВСНГБ намеціў рад важных мерапрыемстваў па разгортваньні ў Беларусі ў 1929-30 годзе сеткі школ фабрычна-заводзкага вучнёўства.

У 1929-30 навучальным годзе адкрыюцца школы фабрычна-заводзкага вучнёўства—мэталістых—у Віцебску на 45 чалавек, дрэваапрацоўшчыкаў у Бабруйску—на 50 чалавек, швэйнікаў у Менску і Віцебску—на 300 чалавек. Школы адкрыюцца не пазьней 15-га верасьня.

Белпапертрэсту прапанавана не пазьней 1-га верасьня скончыць прыём у фабзавуч пры Дабрускай фабрыцы паперы ў колькасьці 50 чалавек, з тым, каб заняткі пачаліся 5-га верасьня. Да 1-га верасьня павінен быць скончаны прыём 60 чалавек у фабзавуч пры ільна-прадзільнай фабрыцы «Дзьвіна».

Скуртрэсту даручана зараз-жа высьвятліць магчымасьць адкрыцьця ў 29-30 годзе фабзавучу аўтнікаў.

Пры ВСНГБ уводзіцца спэцыяльная пасада інспэктара па прафтэхнічнай асьвеце.

Скуртрэсту прапанавана адкрыць школу фабзавучу гарбароў на гарбарні «Бальшавік» з прыёмам да 30 чалавек.

Хроніка Асоавіяхіму

Скончыўся адбор кандыдатаў у вайскова-тэхнічную школу вайскова-паветраных сіл.

* * *

У кастрычніку гэтага году выпускаецца 4-я лётарэя Асоавіяхіму. Па папярэднім разьмеркаваньні на БССР выходзіць 450.000 білетаў.

* * *

На міжнародных плянэрных спаборніцтвах, якія адбудуцца ўвосень гэтага году ў Крыме, прымае ўдзел БССР, у сувязі з чым плянэрным гуртком **ячэйкі Асоавіяхіму БДУ** будуецца плянэр.

* * *

У бліжэйшы час **Менакрсаветам Асоавіяхіму** будзе арганізаваны вазнізаваны прабег самакатнай каманды па маршруце Менск-Чэрвень і назад. Прабег наладжваецца для трэніроўкі падрыхтоўкі самакатнай каманды да ўдзелу ў бліжэйшых манэўрах.

* * *

5 Усесаюзная юбілейная выстаўка служобных сабак і паштовых галубоў адкрываецца 21-га верасьня ў Маскве. Запіс да 5-га верасьня.

Навіны навукі і тэхнікі

НОВАЯ АРХІТЭКТУРА Ў СССР

З праектаў новага дому Цэнтрасаюзу, паданых на сусьветны конкурс, асабліва вызначаецца праект двух вядомых французскіх архітэктараў-мастакоў, Ле Карбузьве і Жэнэрэтала.

У сваім праекце гэтыя архітэктары шырока зварачаюцца да апошняга слова сучаснага манумэнтальнага зодчества — шкла. Спраектаваны імі будынак у значнай меры будзе складацца са шкла, гэтага амаль яшчэ нескарыстанага ў нас будаўнічага матар'ялу, і галоўныя карпусы яго будуць пабудаваны на фундаментальных пілёнах, што ўзвышаюцца над узроўнем вуліцы, дапускаючы бесьперашкодны рух па пляцы пад масывамі будынку.

Асноўная частка спраектаванага будынку в флігелямі, якія разам усе ставраюць у пляне фігуру гіганцкай перакуленай літары лацінскага альфабэту, прызначаецца для работы пастаяннага штату Цэнтрасаюзу — 2.500 чалавек рабочых і служачых. Абодва крайнія флігелі будуць цалкам зашклены з знадворных бакоў, тады як у сярэднім флігелі шкляныя сьцены будуць і в знадворнага і в унутранога фасадаў, так што ўвесь сярэдні корпус будынку будзе празрыстым, а арбочыя памяшканьні ў ім атрымаюць найвыгаднейшае натуральнае дзеннае асьвятленьне.

Рэшта пабудоў будзе нявытворчага характару. У іх будуць памяшканьні для адпачынку, клюбаў, бібліятэк, сходаў, гімнастычнае залі і г. д. аж да тэатру і кіно-сэансаў на вялікую колькасьць глядачоў. Двухпавярховы дах тэатру спраектаваны ў выглядзе трэку, для практыкаваньняў у бегу і пляцоўкі для баскет-болу.

Папраўка

Учора ў заметцы ў газ. «Зьвязда» «Звыш 18 мільёнаў на ўсеагульнае навучаньне» ўкралася памылка. Надрукавана: Адкрываюцца «335 новых камплектаў». Павінна быць: «1335 новых камплектаў».

Паведамленьні

31 жніўня а 5 гадз. увеч. у АК КП(б)Б адбудзецца НАРАДА АБ ХЛЕБАЗАГАТОЎКАХ, на яную павінны зьявіцца: Бюро фракцыі ЦП саюзу, заг. арг. аддзелам гарадзкіх РК КП(б)Б, бюро фракцыі акрвыканкому, фракцыі праўленьня шэфтаварыства, бюро АК КСМ і партыйкі РК КСМ, ніраўлікі ўстаноў — камуністы: з Наркамгандлю, Аргандлю, Белкаапсаюзу, Белсельсаюзу, Менсельпрадсаюзу, Саюзхлебу і ніжэйпаіменаваныя таварышы, вылучаныя АК для паездкі ў вёску па хлебазагатоўках:

Кандрашук, Нацэўскі, Плешакоў, Ашак, Кантаровіч, Казакаў, Глінскій, Багарад, Палхоўскі, Рабцэвіч, Хавіч, Шэдаў, Грынкевіч, Баброў, Кіш, Юрашкевіч, Велічка, Бушман, Верба, Ласкоўскі, Скараход, Шмідт, Мітлін, Філатаў, Адамовіч, Шындлер, Хмялеўсхая, Брэнэйзін, Абрамсон, Матусэвіч, Казак, Мачульскі, Лукашэвіч, Елін, Лысоў, Прынц, Школьнікаў, Смаль, Бунін, Юдзін, Радзюк.

— АПА Менакругкому на 31-VIII—г.г., а 6 г. ув., у памяшканьні АК КП(б)Б, склікае нараду таварышоў, скончыўшых акруговыя курсы рабочых-прапагандыстых у мінулым і ў гэтым годзе.

Парадак дня:

1) Удзел рабочых-прапагандыстых у камплектаваньні сеткі парт. і рабочай асьветы.

2) Аб арганізацыі сэмінарыю і далейшай таварыцкай падрыхтоўцы рабочых-прапагандыстых.

— **КЛЮБ НАВУК ПРАЦАЎНІКОЎ** пасьля рамонту адчыняецца 1 верасьня.

Бібліятэка працуе з 6 да 9 г. увеч.

— **ВЯЧ. РАБ УН-Т. Залікі для студэнтаў 1 і 2 курсу вяч. раб. у-ту будуць праводзіцца в 15 па 30 верасьня г. г., а 7 гадз. увеч., у памяшканьні фізычнага інстытуту БДУ (Земляробскі зав. № 4).**

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Дырэкцыя Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту Сельскае і Лясное Гаспадаркі імя Ў. І. Леніна выказвае глыбокі жаль з прычыны раптоўнай сьмерці Навуковага Кіраўніка Цэнтральнай Бульбяной Станцыі НДУ

акадэміка МІКОЛЫ КІРЫЛАВІЧА МАЛЮШЫЦКАГА

ў начы на 28-е жніўня ў Маскве

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
Пятніца 30 жніўня ПРЭМ'ЕРА „ЛЮДОВИК ... НАДЦАТЫЙ"
Білеты ў касе тэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. касе з 12—2 і ад 4—6 гадз. увеч. Пачатак а 8 з пал. гадз.

КІНО-ТЭАТР „Культура" **НАЧНЫ РАМІЗЬНІК** мастацкі фільм у 6 частк. Зьвыш праграмы: КІНО-ХРОНІКА Саўкіно № 41 Пачатак а 7 з пал. гадз. Каса—ад 6 г.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. Мастацкі фільм паводле аповесьці І. Франка. **Барыслаў сьмяецца** Кіно-аповесьць у 7 част. Пачатак 1 с. а 9 г., 2 с.—10 г. 30 х. Каса ад 7 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал З прычыны вялізнага посьпеху апошнія 3 дні: 30, 31 жніўня і 1 верасьня сусьветны комік МОНТЫ БЭНКС у лепшай камэдыі сэзону **ЛЯТУЧАЕ ШЧАСЬЦЕ** у 7 частках

КІНО Пралетары На прычыне вялізнага посьпеху 2-гі тыдзень Мастацкі фільм вытворч. БЕЛДЗЯРЖКІНО. **ДА ЗАЎТРА** Каса—ад 6 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" Новы цікавы фільм савецкай вытворчасьці **ТРОЕ** у 7 частках. Кіно адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 х., 2-га—а 5 г. Цана білета 10 к. Месцы нумараваныя.

КІНО Спартак З прычыны вялізнага посьпеху апошнія шэсьць гастроляй **В. М. КАРАЛЕВАЙ** выказальніцы расійскіх народных і жартоўных песень. Зусім новы рэпэртуар. На экране грандыёзны замежны фільм **КЕНІГСМАРК** драма ў 7 частках. Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 г.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня

КУРОРТЫ ЗІМОЮ. Некаторыя хваробы лечацца на курортах з наменшым посьпехам у зімовы час, чым у летні.

У ЗІМОВЫ СЭЗОН БУДУЦЬ ФУНКЦЫЯНАВАЦЬ:

Кіславодзк, Паўднёвае Ўзьбярэжжа Крыму, Ялцінскі сухотны тубінстытут, Сечанаўскі Інстытут у Сэвастопалі, Сочы з лячэньнем у МАЦЭСЬЦЕ да 15-XI, Н. МАЦЭСТУ да 15-XII. СОЧЫ для сухотных да 1-XII, УЧ-ДЭРЭ для сухотных да 15-XII, СУХУМ для сухотных, дзіцячы косн. сухотн. у **Алупцы, Геленджыцы і Зўпаторыі, Стара-Руса** (грязявое лячэньне), санат. **„Таласа" ў Зўпаторыі** для косн. сухот даросных да 31-XII.

Беларускае курбюро ПРЫМАЕ ЗАЯЎКІ на памянёныя вышэй курорты, прычым рабочым пад гарантыю адміністрацыі ДАЕЦЦА КРЭДЫТ на 9 месяцаў, а служачым—на 3 месяцы.

Больш падрабязныя весткі—у курбюро: Менск, Рэвалюцыйная, 2.

2 ДНІ ЗАСТАЛОСЯ ДА 1 ВЕРАСЬНЯ

Пасьпяшэцеся падпісацца на ВЕРАСЕНЬ і далейшыя тэрміны НА ГАЗЭТУ

ЗЬВЯЗДА

орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.

«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопіс

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, не ўпаўнаважанымі, адз. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.

Па акругах: Упаўнаважанымі газэты «Зьвязда», адз. «Известия» і «Правда», кіёскамі к-ва Друку і ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ВЫШЛІ з ДРУКУ і ПРАДАЮЦЦА

А. МІХАЙЛАЎ **Задачы асеньняй сел.-гаспадарчай кампаніі 1929 г.** Ц. 10 кап.

М. ТУХАЧЭЎСКІ **Памятка чырвонаармейцу на манэўрах** Ц. 5 кап.

БЕЛСЕЛЬСАЮЗУ ПАТРАБУЮЦЦА на сэзонную працу па загатоўках яблык **СПЭЦЫЯЛІСТЫЯ-ФРУКТОЎШЧЫКІ,** якія маюць салідны загатоўчы стаж і ведаюць стандартную апрацоўку тавару, на пасады раённых упаўнаважаных для загатоўкі 75—100 вагонаў яблык у сэзон.

Аплата па згодзе.

Прапановы адрасаваць: БЕЛСЕЛЬСАЮЗ, Менск, Савецкая, 46.

РАХУНКАВОДНА-БУХГАЛЬТАРСКІЯ **КУРСЫ** пры АКРАНА